ЗЬВЯЗДА

Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

№ 156 (3264) Чацьвер, 11-га ліпеня 1929 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

Пратэст левых арганізацый Польшчы супроць недапушчэньня дэлегацыі працоўных палякаў з СССР

ВАРШАВА, 10. Друку разасланы бюлетэн «камітэта па прыёме польскай рабоче-селянскай дэлегацыі з СССР на зьезд закардонных палякаў». У бюлетэні, між іншым, зазначаецца, што недапушчэньне дэлегацыі з СССР прадыктована жаданьнем скрыць той факт, што польская працоўная меншасьць у СССР гатова абараняць Савецкі Саюз ад замахаў польскага імпэрыялізму і яго хаўрусьнікаў. Пратэст падпісан ад імя камфракцыі сойму—Сыпулай, ад сельробу—Вальніцкім і ад беларускага рабоча-селянскага клюбу—Дварчанінам.

На бесьперапынны рабочы тыдзень

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Прафактыў фабрыкі „Вэзуві" выказаўся за пераход на бесьперапынны рабочы тыдзень і даручыў заводакіраўніцтву, разам з вытворчай камісіяй, ажыцьцявіць гэты пераход.

9 ГОД НАЗАД РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ БЕЛАРУСІ, ПАДТРЫМАНЫЯ ПРАЛЕТАРЫЯТАМ УСЯГО САЮЗУ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, РАЗГРАМІЛІ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫ БЛЁК ПОЛЬСКІХ ІМПЭРЫЯЛІСТЫХ З МЯСЦОВАЙ БУРЖУАЗІЯЙ І ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ АДРАДЖЭНЬНЕ САВЕЦКАЕ УЛАДЫ НА БЕЛАРУСІ

Толькі саюз з усімі брацкімі савецкімі рэспублікамі, упартая работа па будаўніцтве сацыялізму, па сапраўдным забесьпячэньні раўнапраўя нацыянальнасьцяй, барацьба з капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі, з шавінізмам усіх масьцей—забясьпечылі ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту, саюз рабочай клясы з працоўным сялянствам і тыя дасягненьні, якія мы маем сёньня.

ІХ ГОД

АДОЗВА ЦК КП(б)Б ДА УСІХ РАБОЧЫХ, СЯЛЯН, ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І УСІХ ПРАЦОЎНЫХ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

9 год таму назад пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу разам з рабочымі і сялянамі Беларусі, аб'яднаныя ў Чырвонай арміі, у партызанскіх атрадах, ачысьцілі захопленую польскімі імпэрыялістымі тэрыторыю Савецкай Беларусі і далі, такім чынам, магчымасьць разгортваньня сацыялістычнага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

9 год напружанай працы рабочых і сялян Савецкай Беларусі пры дапамозе працоўных усяго Савецкага Саюзу забясьпечылі ня толькі адбудаваньне зруйнаванай імпэрыялістычнай вайной, акупантамі і бандамі нашай гаспадаркі, але і паставілі яе на вышэйшую ступень. Беларусь з краю жабрацтва, нацыянальнага ўціску і культурнай цемры становіцца краінай, дзе працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, з вялікім творчым захапленьнем будуюць сваю сацыялістычную гаспадарку, сваю культуру. Расьце Асінбуд, будуюцца сотні новых фабрык і заводаў, расьце і калектывізуецца сельская гаспадарка, адчыніліся тысячы школ, працуюць Акадэмія Навук, унівэрсытэты, навукова-дасьледчыя інстытуты, тэатры, больніцы і санаторы, расьце і квітнее беларуская культура і культура ўсіх нацыянальнасьцяй, што насяляюць Савецкую Беларусь.

Цьвёрдым крокам Савецкая Беларусь, у цесным саюзе з іншымі Савецкімі рэспублікамі, ідзе наперад да сацыялізму. У рашучай клясавай бойцы на эканамічным і культурным фронце выбіваецца са сваіх клясавых пазыцый вораг — нэпман у горадзе і кулак на вёсцы.

Але-ж посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва будуць замацаваны толькі тады, калі кожны рабочы, кожны селянін і ўсякі, каму дорага справа сацыялістычнага будаўніцтва, з яшчэ большай рашучасьцю, яшчэ большай упартасьцю сваім актыўным удзелам будзе дапамагаць гэтай справе.

Таварышы рабочыя і сяляне! Абвесьцім рашучую барацьбу прагульшчыкам, падарам, п'яніцам, бюракратам і яшчэ больш рашуча павядзем наступленьне на прыватна - капіталістычныя элемэнты ў горадзе і вёсцы; шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва, зробім яго матэрыялам усёй нашай працы, даб'ёмся праз яго канкрэтных вынікаў, зьнізім собекошт і палепшым якасьць прадукцыі. Рашуча павядзем змаганьне з міжнацыянальнай варожасьцю, антысэмітызмам, шавінізмам і нацыянал-дэмакратызмам усіх колераў, замацуем брацтэрскі саюз працоўных усіх нацыянальнасьцяй, замацуем яшчэ больш наш саюз з братэрскімі савецкімі рэспублікамі.

Таварышы рабочыя і сяляне! У творчым захапленьні будаўніцтва сацыялізму ні на хвіліну ня будзем забываць, што імпэрыялістыя ўсяго сьвету пры актыўнай дапамозе і ўдзеле сацыялфашыстых рыхтуюцца да новай вайны і ў першую чаргу вайны супроць Савецкага Саюзу.

За кошт бязьлітаснай эксплёатацыі мільёнаў рабочых і сялян і прыгнечаных народаў калёніі імпэрыялістыя будуюць новыя браняносцы, паветраны флёт, рыхтуюць новыя газы. А таму працоўныя Савецкага Саюзу, дэманструючы сваю волю да міру, прапануючы канкрэтныя формы разбраеньня, ні на хвіліну не павінны забываць небясьпекі новай вайны. Будуючы сацыялістычную гаспадарку і культуру, будзем упарта і рашуча рыхтавацца даць ворагу ў выпадку нападу рашучы адпор. Узмоцнім нашу слаўную Чырвоную армію, дапаможам ёй у яе вучобе, узмацнім яе вайсковую магутнасьць, яшчэ цясьней зьвяжамся з ёю. Станем усе ў рады Асоавіяхіму, каб актыўным удзелам у рабоце яго забясьпечыць на выпадак нападу на нас наш тыл. Будзем памятаць, што найлепшая падрыхтоўка кожнага працоўнага да абароны забясьпечыць наша мірнае сацыялістычнае будаўніцтва ад нападу.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Чырвоная армія вызваліла 9 год таму назад Савецкую Беларусь.

Таварышы чырвонаармейцы, памятайце слаўныя традыцыі Чырвонай арміі і моцна стойце на варце сацыялістычнага будаўніцтва, аўладаўце ўсёй вайсковай тэхнікай, каб у патрэбны момант даць ворагу рашучы адпор.

Таварышы рабочыя, сяляне, чырвонаармейцы і ўсе працоўныя! У слаўнае 9-годзьдзе мы ня можам забыць пра нашых братоў сялян і рабочых Заходняе Беларусі, што енчаць у кіпцюрох польскага фашызму. Ім сёньня мы шлем сваё братэрскае прывітаньне.

Няхай жыве сацыялістычнае будаўніцтва!

Узмоцнім наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі!

Няхай жыве магутны саюз рабочае клясы і працоўнага сялянства!

Няхай жыве моцны саюз працоўных усіх нацыянальнасьцяй!

Няхай жыве Чырвоная армія — абаронца працоўных!

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве Камінтэрн!

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі

На руінах будуем палацы...

Ул. Дубоўка

У ПАДАРОЖЖЫ

(Да 9-й гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў)

...І вось пакінуў я шумлівы горад,
пашоў па тых шляхох, па тых дарогах,
дзе крыўда гойсала бадай учора,
дзе зьдзекваўся над краем люты вораг.

Віецца сьцежка ў акіяне збожжа,
разгортвае малюкі і падзеі.
І няпрыгожае тут зробіцца прыгожым,
у безнадзейным знойдуцца надзеі,

Пазбыўшы цяжкія усе напасьці,
пазнаўшы сэнс у згодзе і нягодзе,—
ствараюць самі долю тут і шчасьце,
пра будучыню варажыць ня ходзяць.

Расьце падмурак у імпэце творчым.
расьце і вольнай працы камяніца.
Мы пабудову даваршым і скончым
няхай варожасьць долу камяніцца.

У акіяне збожжа ходзяць хвалі,
само жыцьцё ў іх песьціцца і сьпее.
А зараз песьні будуць тут крышталіць,
А зараз выйдуць на палеткі жнеі.

Гляджу на ўсё і думы набягаюць:
які размах, якая перамена!
І постаць стала у людзей ня тая,
у даўнасьць адышла часіна гэна,—

калі скараліся перад панамі
у тры пагібелі згінаці каркі.
Другія далягляды перад намі
для нас і нашай гаспадаркі.

І затрымаць энэргіі вірлівай
тупагаловы ўжо ня прыдзе нехта.
Душыць ня будуць ініцыятывы
і творчасьці працоўных інтэлектаў...

Хапае злых учынкаў і аблуды,
але наколькі ёсьць і дзеяў добрых!
Пра гэта сьведчыць нам усё і ўсюды,
гаворыць тысячамі фактаў дробных.

Віецца сьцежка ў жытнім акіяне,
на хвалях родзяцца акорды, гімны.
І ў гэтым урачыстым хваляваньні
настрой ствараецца уздымны.

Ня выказаць яго ў звычайных формах.—
Няхай дадасьць мэлёдыю музыка.
І павадкай узьнеслай і мажорнай
успавіць дзень падзеямі вялікі:

ЛІПНЁВЫ ГІМН

Гордымі ўздымамі творчае працы
мы на руінах будуем палацы.

Заваяваўшы сваё вызваленьне—
шчасьце будуем мы для пакаленьняў.

Слава гэроям ліпнёвых паходаў!
Слава гэроям дваццатага году!

Вышэй галовы, шчыльней у колёнах!—
да перамогі ідуць міліёны.

Гордымі, ўздымамі творчае працы
мы на руінах будуем палацы.

Мы аб'яднаем ля нашых штандараў
сілу ўсю беларускіх абшараў.

А. Хацкевіч

БССР—ПА ШЛЯХУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

З дапамогай рэвалюцыйнага расійскага пралетарыяту рабочыя і бяднейшыя сяляне пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў дні вялікага Кастрычніка скінулі уладу панаў, капіталістых і ўтварылі ў краіне ўладу саветаў — дыктатуру пралетарыяту. У пяршыню гісторыі, пасьля Кастрычніка, Беларусь стала вольнай краінай, Савецкай дзяржавай, якая ў гэтым годзе асьвяткавала дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня. У ліку гэтых дзесяці — на працягу амаль аднаго году, значная частка тэрыторыі сучаснай Савецкай Беларусі знаходзілася пад акупацыяй польскіх паноў, **якія ўчынялі крывавую расправу над рабочымі і сялянамі Беларусі. Гэтага часу польскага панаваньня, зьдзекаў над працоўнымі Беларусі рабочыя і сяляне і ўсе працоўныя масы ніколі не забудуць.** Не забудуць таксама і таго, што знайшоўшыя сабе прытулак па-замежамі Савецкай Беларусі розныя здрадніцкія дзячы так званай «Беларускай рады» і іншыя, якія разам з панамі, гандлярамі і ўсякімі нашымі ворагамі, пры дапамозе сусьветнага капіталу, разам з белабандамі, вялі барацьбу супроць Савецкай улады.

Ня могуць забыць і не забудуць рабочыя і сяляне белапольскіх расстрэлаў, катаваньня насельніцтва шампаламі і драцянымі бізунамі, бязьлітасных рэквізыцый, зьнішчэньня агнём раду вёсак, мястэчак і зруйнаваньня раду гарадоў. Адказам на белапольскі напад на краіну мірнага будаўніцтва маладой Савецкай Рэспублікі было масавае фармаваньне добраахвотных партызанскіх атрадаў з лепшых сыноў рабочых і сялян Беларусі, якія і вялі рашучую барацьбу з арміяй «белага арла» да поўнага вызваленьня Савецкай Беларусі.

11-га ліпеня дзевяць год назад Чырвоная армія з актыўнай дапамогай партызанскіх атрадаў заняла сучасную сталіцу Савецкае Беларусі Менск і ў хуткім часе ачысьціла ўвесь абшар Беларусі ад войск белапанскай Польшчы. Морам крыві, агнём пажараў, пакутамі і сьмерцю сваіх найлепшых сыноў заплаціла Беларусь за сваё вызваленьне з-пад белапанскага крывавага прыгону. **Вось чаму 11-га ліпеня — дзень вызваленьня — ніколі ў жыцьці БССР ня страціць сваёй урачыстасьці, ён не перастане абуджаць у сэрцы кожнага рабочага, кожнага селяніна найлепшых, радасных, сьветлых пачуцьцяў.** Гэты дзень гэраічнага вызваленьня нашай краіны з-пад польскага панства зьяўляецца днём, пачынаючы ад якога сярмяжная Беларусь, загойваючы свае крывавыя раны, **усімі сіламі і сродкамі, пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі, вядзе справу будаўніцтва сацыялізму.**

Цяжкую спадчыну атрымала Савецкая Беларусь ад мінулага наогул, асабліва шырокую і глыбокую крывавую баразну пакінула на Беларусі нячувана жорсткая белапольская акупацыя. Адзначаючы сёньня малюнак поўнага разбурэньня і запусьценьня Беларусі, вышаўшай дзевяць год таму назад з-пад белапольскай акупацыі, робячы параўнаньні з тымі дасягненьнямі, якія мы маем зараз, мы можам з гонарам сказаць, што пралетарыят і працоўныя масы Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам нашай партыі **значна залячылі раны мінулай спадчыны і вышлі на шыроні шлях сацыялістычнага будаўніцтва.**

Правільна вырашанае партыяй і Савецкай уладай нацыянальнае пытаньне абудзіла энэргію і здольнасьці працоўных мас усіх нацыянальнасьцяй, адчыніла дзьверы для поўнай магчымасьці ўдзелу іх у сацыялістычным будаўніцтве. У той час, як у буржуазных дзяржавах праводзіцца палітыка эксплёатацыі і прыгнечаньня слабейшых меншых нацыянальнасьцяй, **у той час, як беларускае насельніцтва за межамі Савецкага Саюзу падпадае эканамічнаму, палітычнаму і культурнаму прыгнечаньню, — у Савецкім Саюзе, у Савецкай Беларусі працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй карыстаюцца роўнымі правамі ва ўсіх галінах культурнага, нацыянальнага і эканамічнага разьвіцьця.**

Кожнай нацыянальнасьці рознымі спэцыяльнымі мерапрыемствамі Савецкая улады і штодзённай практычнай работай Саветаў забясьпечваецца поўная магчымасьць эканамічнага і культурнага разьвіцьця.

Савецкая Беларусь мае на сваёй тэрыторыі досыць школ, розных культасьветных устаноў, а таксама савецкіх і грамадзкіх органаў, якія ў мясцовых большасьці насельніцтва нацменшасьцяй вядуць працу на іх роднай мове. Працоўныя нацменшасьцяй БССР на сваіх зьездах і канфэрэнцыях ня раз заяўлялі, **што толькі ў БССР, як і ва ўсім Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, на падставе дыктатуры пралетарыяту, забясьпечана права на палітычнае, эканамічнае і культурнае разьвіцьцё ўсіх нацыянальнасьцяй.** Савецкая Беларусь у галіне правядзеньня нацпалітыкі і беларусізацыі, культурна-гаспадарчага абслугоўваньня нацменшасьцяй, будаўніцтва нацыянальнай савецкай культуры і эканомікі да дзевятай гадавіны свайго вызваленьня мае вялізарнейшыя посьпехі.

Беларуская прамысловасьць значна перавысіла даваенны ўзровень; будаўніцтва фабрык і заводаў, якое пашыраецца і паляпшаецца ў Беларусі, узмацняе кіруючую ролю пралетарыяту ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве, павялічвае сацыялістычны сэктар і ўдзельную яго вагу ва ўсёй народнай гаспадарцы, наша прамысловасьць усё больш і больш забясьпечвае сваім фабрычным прадуктам патрэбы працоўнага насельніцтва. Такія факты, як напрыклад, будаўніцтва раённай электрастанцыі імя Сталіна, гаворыць ад тым, **што Савецкая Беларусь разам з Савецкім Саюзам праз некалькі год будзе зроблена з аграрнай індустрыяльнай краінай.** Паляпшаецца сельская гаспадарка, асушаюцца і ператвараюцца ў ніві дзесяткі тысяч гэктараў забалочаных зямель. Сотні тысяч сялянскіх двароў аб'яднаны ў розныя віды каапэрацыі. Расьце сацыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы, узмацняюцца саўгасы, магутнай хваляй разгортваецца калгаснае будаўніцтва.

На падставе эканамічнага разьвіцьця пашыраецца і паглыбляецца савецкая беларуская культура, культура працоўных усіх нацыянальнасьцяй. У краіне, дзе ня было ніводнае беларускае школы, створаны тысячы новых школ, у якіх дзеці рабочых і сялян вучацца на сваёй роднай мове. Дзе ня было ніводнай вышэйшай навучальнай установы, сёньня маем рад сярэдніх і вышэйшых школ, а таксама дасьледчых інстытутаў і такую ўстанову, як БАН.

Адпак, пры вырашэньні задач мірнага сацыялістычнага будаўніцтва, асабліва сёньня — у дзень сьвята дзевятай гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, **мы павінны ведаць і памятаць тую базупынную падрыхтоўку вайны супроць СССР, якая вядзецца сусьветнай капіталістычнай буржуазіяй.** Нам трэба памятаць, што на БССР, якая знаходзіцца на рубяжы з капіталістычным сьветам, ляжыць задача асабліва востра сачыць за спробамі імпэрыялістых пачаць новы напад на нашу краіну. Нам трэба яшчэ больш узмацняць абароназдольнасьць краіны, каб быць падрыхтаванымі ў патрэбную хвіліну ўсім стаць на абарону Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Нам трэба ў дзесяткі раз павялічыць клопаты аб нашай слаўнай Чырвонай арміі, якая была і будзе лепшым сродкам абароны краіны Саветаў у барацьбе за сусьветны Кастрычнік.

Хай ведаюць паны і капіталісты, што наша падрыхтоўка да абароны зьяўляецца адказам на сабатаж прапаноў ураду Саюзу ССР аб усеагульным разбраеньні, на тую шалёную падрыхтоўку да вайны в боку імпэрыялістычных дзяржаў супроць сацыялістычнай бацькаўшчыны пралетарыяту — саюзу ССР.

Мы імкнуліся і заўсёды імкнемся да міру, але стаялі і будзем цьвёрда стаяць на варце абароны межаў Савецкага Саюзу.

Зах. Беларусь пад ботам польскага фашызму

ГОЛАД, ЭПІДЭМІІ, НЕПАСІЛЬНЫЯ ПАДАТКІ, ЗРУЙНАВАНЬНЕ БЯДНЯЦКІХ І СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК, БЯЗЬЛІТАСНАЕ ЗЬНІШЧЭНЬНЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ БАГАЦЬЦЯЎ КРАІНЫ, СТРАШЭННЫ ЭКАНАМІЧНЫ І ПАЛІТЫЧНЫ ЎЦІСК—ГЭТКАЕ СТАНОВІШЧА ПРАЦОЎНЫХ У ЗАХ. БЕЛАРУСІ ПАД ПАНСКІМ ЯРМОМ

Савецкая Беларусь ужо даўно залячыла свае раны, зробленыя ёй імпэрыялістычнай і грамадзянскай войнамі, а таксама пэрыядам жорсткае акупацыі белапалякаў, калі рэвалюцыйныя масы беларускага сялянства расплачваліся сваёй крывёю і сялзьмі за памешчыцкую зямлю, адабраную рэвалюцыяй у польскіх паноў. За мінулыя 9 год Савецкая Беларусь гіганцкімі крокамі пайшла наперад ад тэй мяжы, якая носіць назву даваеннага ўзроўню гаспадарчага, палітычнага і культурнага разьвіцьця нашай краіны.

Ня тое на землях Заходняе Беларусі, якая пакутуе пад пятою польскіх акупантаў. Працоўныя і эксплёатаемыя масы Зах. Беларусі да гэтага часу яшчэ жорстка церпяць ад пасьляваеннай разрухі. **Шмат у якіх мясцох яшчэ тысячы і тысячы сялянскіх сем'яў павінны туліцца ў зямлянках, бліндажох акопаў, што засталіся ад імэрыялістычнае вайны.**

Уся палітыка польскага фашызму, накіраваная на ўзмацненьне эканамічнае магутнасьці польскай буржуазіі і памешчыкаў на землях Зах. Беларусі, яшчэ больш палічвае разбурэньне сялянства. Польскі ўрад ліквідзе сэрвітуты, г. зн. права селяніна пасьвіць сваю жывёлу на панскіх сенажацях і ў панскім лесе, права, якім селянін карыстаўся з таго часу, як польскі пан або апалячаны беларусі баярын захапілі ў сваю ўласнасьць сялянскія мірныя ўгодзьдзі. Ліквідацыя сэрвітутаў ідзе на карысьць памешчыка, бо яна павялічвае яго маёнтак.

Серадняцкія-ж і бядняцкія сялянскія масы плацаць за гэту ліквідацыю поўным сваім разбурэньнем.

З тэй-жа мэтаю: выдзяліць панскія землі ў адзін гаспадарчы комплекс, адгаяліць іх ад сялянскіх кліньяў, дапамагчы кулаку сабрацьцца ў адзін кавалак сваю зямлю і стаць мацней на ногі, праводзіцца ўладаю так званая камасацыя або зямляўпарадкаваньне.

Тая-ж самая палітыка дапамогі памешчыку і кулаку вядзецца польскім фашысцкім урадам па лініі парцэляцыі зямлі, таксама, як і па лініі падаткаў і крэдытнай палітыкі. Парцэлюючы на вельмі высокай, штучна ўзьнятай цане лязначную колькасьць памешчыцкае зямлі, найгоршай па якасьці, найменш карыснай для капіталістычнае апрацоўкі, зямлі, якая па сутнасьці зьяўляецца памехаю для памешчыка, урад Пілсудскага перакачвае ў памешчыцкія гаспадаркі новыя зваротныя сродкі з вёскі. Адначасова сваёй крэдытнай палітыкай ён стварае магчымасьць **толькі эксплёататарскай частцы вёскі—кулацтву захапіць гэту зямлю** і такім чынам пашырыць гаспадарчую базу кулацкай эксплёатацыі.

Пры разьмеркаваньні падаткаў, большая частка іх цяжару ўрад ўскладае на плечы маламоцных гаспадарак, штурхаючы іх у поўную кабалу да памешчыкаў і кулакоў.

Той-жа прынцып захоўваецца пры крэдытнай палітыцы. Беднаму селяніну і серадняку, які ня можа прадставіць саліднага забесьпячэньня, прадастаўляецца нязначны крэдыт на тэрмін ад 6 да 9 месяцаў. У выніку гэтага крэдыты зьяўляецца пятлёю для бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, бо на атрыманы крэдыт селянін ня ў стане зрушыць з мёртвага пункту сваю гаспадарку, а кароткія тэрміны і высокія процанты прымушаюць яго ўвосень за бясцонак распрадаваць і ўраджай і маемасьць, каб толькі разьвязацца з гэтымі крэдытамі. Зразумела, гэта не датычыць ні кулакоў, ні памешчыкаў, якія і па вялічыні крэдытаў і па тэрмінах пастаўлены ў прывілеяванае становішча.

На фоне гэтай бязьлітаснай эканамічнай эксплёатацыі вёскі памешчыкамі і кулакамі пры дапамозе фашысцкай аграрнай, падатковай і крэдытнай палітыкі расьце **разбурэньне** і паўпярэзацыя бядняцкіх і серадняцкіх мас Заходняе Беларусі. Ужо ў пачатку зімы беднота і сераднякі з прычыны голаду былі прымушаны забясцэнак распрадаваць свой інвэнтар і хадзіць на паклон да кулакоў і памешчыкаў за мерку бульбы і некалькі кілё збожжа, закабаляючы і сябе і свае сем'і на адпрацоўку ім улетку, у гарачыя дні жніва.

У той час, калі выміралі з голаду вёскі Зах. Беларусі, калі на гэтым голадзе багацелі памешчыкі і кулакі, урад фашысцкае Польшчы быў заняты барацьбою з крамолаю і ўзмоцненымі рыхтаваньнямі да вайны супроць СССР. Ад часу да часу ўрадавы і апазыцыйна-фашысцкі друк, таксама, як і ўсе згодніцкія і сацыял-фашысцкія органы пісалі пра нэндзу і галечу сялян Заходняе Беларусі і заклікалі да наладжэньня філянтрапічных вечарынак, танцуляк і базараў на карысьць галадуючых сялян Зах. Беларусі. Аднак, расьпісваючыся аб дапамозе сялянству і нават пасылаючы вагоны са збожжам і сенам, зразумела за гатоўку і па рыначных, павышаных цэнах, **фашысцкі ўрад не забыўся вымагаць ад паміраючага з голаду сялянства падаткаў і нядоімак. Арганізуючы харчаваньне для дзяцей паміраючага з голаду насельніцтва, фашысцкія буржуазна-памешчыцкія камітэты «дапамогі» галадуючым не забыліся патрабаваць па 30 грошай, даплаты за дзіцячае сьнеданьне**

Побач з узмоцненай эксплёатацыяй працоўных мас сялянства і гарадзкога пралетарыяту Зах. Беларусі буржуазіяй, памешчыкамі, кулакамі і асаднікамі, **пад абаронаю фашысцкага тэрору ішоў працэс калёніяльнага рабаўніцтва польскімі акупантамі прыродных багацьцяў Зах. Беларусі. Самым драпежніцкім і барбарскім спосабам фашысцкі ўрад і памешчыкі па-барбарску зьнішчалі асноўнае багацьце краіны: лясы,** высякаючы лесасекі на многія дзесяткі год наперад. **Заходняя Беларусь дастаўляе 70 проц. усяго лясного сырцу, які здабываецца ў Польшчы.**

Палітыка польскага фашызму была накіравана на тое, каб як мага мацней упарадкаваць польскую акупанцкую уладу на Зах. Беларусі і **як мага лепш падрыхтаваць Зах. Беларусь да ролі пляцдарма для нападу польскага імпэрыялізму на СССР.**

Прыцягваючы беларускія буржуазныя элемэнты ў лягер польскай акупацыі, фашысцкі ўрад адначасова вёў бязьлітасную палітыку нацыянальнага прыгнечаньня ў адносінах да асноўных працоўных і эксплёатаемых мас Заходняй Беларусі. Гэта палітыка нацыянальнага прыгнечаньня дапаўняла і завяршала палітыку сацыяльнага прыгнечаньня і эксплёатацыі, якую праводзіў польскі ўрад у інтарэсах заможных кляс Польшчы. **Польскі фашысцкі ўрад пасьлядоўна праводзіў палітыку ўсіх ранейшых акупацыйных урадаў. Ён з лютасьцю праводзіць палітыку палянізацыі і дэнацыяналізацыі беларускіх працоўных і эксплёатаемых мас.** Яно шалёна граміць усякія праявы рэвалюцыйнай барацьбы працоўных ЗБ. **Кожная арганізацыя, якая ставіць сабе задачу абарону інтарэсаў працоўных мас, жорстка разграмляецца акупанцкімі ўладамі і ўсякага роду баявымі фашысцкімі арганізацыямі.**

Працоўныя і эксплёатаемыя масы Заходняй Беларусі яшчэ больш, чым працоўныя і эксплёатаемыя масы карэннай Польшчы **пазбаўлены ўсіх найбольш элемэнтарных праў. Яны зданы на міласьць паліцэйскіх правадыроў, хабарнікаў і забойц.** Усе рэвалюцыйныя арганізацыі: прафсаюзы у гарадох, у мястэчках на прадпрыемствах, раскіданых па вёсках і на фальварках, ліквідуюцца паліцыяй, а дзеячоў гэтых арганізацый кідаюць на доўгія гады ў турмы. Стотысячная Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада, якая сеткаю сваіх гурткоў ахапіла ўсе вёскі Зах. Беларусі і здолела арганізаваць рэвалюцыйную волю працоўных і эксплёатаемых мас ЗБ, навысіць іх палітычны ўзровень і сьвядомасьць, была разгромлена паліцыяй і фашысцкімі бандамі. Лепшыя работнікі і правадыры Грамады кінуты ў турмы. **Незалежная прэса,** якая адбівае рэвалюцыйныя імкненьні беларускіх працоўных мас, **шляхам бязупынных канфіскацый, штрафаў, арыштаў, збойстваў яе работнікаў была зьнішчана. Таксама прасьледваліся і культурна-асьветныя беларускія арганізацыі.** Так, Таварыства Беларускай школы, якое здолела арганізаваць ў сваіх гурткох дзесяткі тысяч сялян, і правяло вялікую культурна-асьветную работу сярод гэтых мас, было таксама разгромлена паліцыяй, пасьля таго як спроба сфашызаваць гэтае таварыства шляхам разгону гурткоў ТБШ і перадачы кіраўніцтва гэтага таварыства ў рукі беларускіх нацыянал-фашысткіх Астроўскага, Луцкевіча і інш., якія запрадаліся польскаму фашызму,—пацярпела крушэньне.

У мэтах тэрору на Заходняй Беларусі шырокае ўжываньне атрымаў царскі крымінальны кодэкс і яго славуты 102 артыкул. Паводле гэтага артыкулу, **рабочыя і сялянскія дзеячы за сваю самаадданую барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры і супроць памешчыцка-буржуазнай эксплёатацыі прыгаварваюцца да многіх год зьняволеньня.** Нядаўна у Беластоку, у працэсе «35» былі першыя прыгаворы па 15 і 12 год катаргі. На днях скончыўся працэс сялян Косаўшчыны ў колькасьці 71, з якіх многія былі прыгавораны **таксама да 15 год катаржнай турмы.**

Але судовая машына для фашызму зьяўляецца занадта грамоздкай, таму фашызм б'е жорсткім тэрорам і катаваньнямі ў дэфэнзыве. Нярэдкія забойствы паасобных актывістых нібы в прычыны «спробы ўцёчы». **Гэтыя формы тэрору фашысцкі ўрад праводзіць побач з формамі эканамічнага тэрору.**

На паасобных сялян, якія спрабуюць арганізаваць сялянскія масы, якія спрабавалі, напрыклад, арганізаваць пад кіраўніцтвам беларускага рабоча-сялянскага пасольскага клюбу дапамогу галадаючаму насельніцтву ЗБ старасты накладалі штрафы ў суме 500 злотых. Такі штраф зьяўляецца поўным разбурэньнем сялянскае гаспадаркі. Акрамя такіх вялікіх штрафаў мясцовая паліцыя накладае на вясковых актывістых і ўсю вясковую масу, якая не ідзе на паваду у фашыстых «дробныя» штрафы в любой прычыны, напрыклад, за адсутнасьць у селяніна на вёсцы ўборнай 15-25 зл. штрафу, за непабелку плота або хаты 15-25 зл. штрафу, за тое, што сялянскі сабака бегаў па вуліцы вёскі—зноў штраф. Акрамя штрафаў практыкуюцца высяленьні ненадзейных элемэнтаў з роднай вёскі ў іншыя мясцовасьці Польшчы.

Гэтымі мэтадамі фашыскі ўрад спрабуе паралізаваць рэвалюцыйную барацьбу працоўных і эксплёатаемых мас гораду і вёскі Заходняй Беларусі. Але ўсе гэтыя мерапрыемствы толькі павялічваюць рэвалюцыйны рух у масах, толькі ўзьнімаюць нянавісьць працоўных і эксплёатаемых мас да фашысцкага рэжыму і да памешчыкаў.

Рэвалюцыйная хваля на ЗБ, як і ва ўсёй Польшчы, расьце і кожная перамога на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, на фронце будаўніцтва пралетарыяцкай па зьместу і нацыянальнай па форме культуры ў БССР, кожная перамога на фронце арганізацыі братэрскага сужыцьця тых многіх нацыянальнасьцяй, якія ўкраплены ў асноўныя масы беларускае рабочае клясы і сялянства БССР, узмацняе гэтую хвалю і набліжае час перамогі працоўных і эксплёатаемых мас ЗБ і ўсёй Польшчы над сваімі сацыяльнымі і нацыянальнымі прыгнятальнікамі і клясавымі ворагамі.

ЦІХАН.

Роўнасьць нацыянальнасьцяй на справе

Члены інтэрнацыянальнага калгасу «Новы Сьвет» у Гомельшчыне

БЕЛАРУС, ЯЎРЭЙ, ПАЛЯК

У дзень 9-й гадавіны вызваленьня Беларусі мы ня можам забыць пра нашых братоў рабочых і сялян Заходняе Беларусі, што стогнуць у кіпцюрох польскага фашызму. Ім сёньня мы шлем сваё братэрскае прывітаньне

НА ШЛЯХУ ВЫРАШЭНЬНЯ ВЯЛІКІХ ЗАДАЧ

Значныя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве, якія дасягнуты на працягу апошніх год, яшчэ больш павялічацца ў далейшым пры ўзмацненьні кіруючай ролі прамысловасьці

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі—за поўнае выкананьне пляну бягучага году—першага году пяцігодкі

З векавых балот квяцістыя саўгасы і калектывы

У гістарычны дзень 11-га ліпеня, у дзень вызваленьня БССР ад белапалякаў, гаворачы аб нашым сацыялістычным будаўніцтве, нельга абыйсьці моўчкі пытаньняў мэліярацыйнага будаўніцтва.

У нядаўна надрукаваным артыкуле тав. Затонскага «Па балотах Беларусі» сказана: «ёсьць поўная магчымасьць, і гэта ў надыходзячыя дзесяцігодзьдзі будзе зроблена, ператварыць краіну балот у культурнейшы раён Саюзу».

Прыведзены артыкул напісан тав. Затонскім у выніку агляду адной з мэліярацыйных работ, якая праводзіцца зараз на тым месцы, дзе дзевяць гадоў таму назад грымелі гарматы і трашчалі кулямёты. Тав. Затонскім апісана, праўда, самая буйнейшая мэліярацыйная работа БССР, але ўсё-ж **толькі адна** работа.

Акрамя гэтай буйнейшай работы зараз праводзіцца яшчэ надзвычайна вялікая колькасьць (некалькіх соцень) параўнальна дробных работ, дробных па аб'ёме, але буйных па сваім значэньні, па тэй ролі, якую яны павінны адыграць у справе рэканструкцыі і калектывізацыі гаспадаркі Беларусі.

Каб уявіць сабе ўсю грандыёзнасьць праробленай за зусім кароткі тэрмін мэліярацыйнай работы, падамо некалькі найбольш характэрных лічбаў.

Трэба сказаць, што гідратэхнічнае будаўніцтва ў больш або менш заметных разьмерах пачало разьвівацца толькі з 1925 г., а культуртэхнічныя работы—з 1926 г. Такім чынам, цяперашні сэзон 1929 г. ёсьць толькі, па сутнасьці, 5-ты сэзон больш-менш значных работ па мэліярацыі ў БССР. Для параўнаньня падамо некалькі лічбаў, якія характарызуюць дарэвалюцыйную мэліярацыю.

За доўгі час з 1873 году па 1917 год, значыць за 44 гады, было выканана работ на суму каля 6 мільёнаў руб. Кошт мэліярацыйных работ, праведзеных за мінулае пяцігодзьдзе (24-28 г.) вызначаецца ў 6½ мільёнаў руб. Калі параўнаць работу толькі ў даваенных рублёх, дык тэмп мэліярацыі мінулага пяцігодзьдзя большы дарэвалюцыйнага ў 4 разы. Сярэдні гадавы тэмп работ на пяцігодзьдзе 1928-29—32-33 г. у 50 раз больш. Досьць аднэй лічбы, каб бачыць усю грандыёзнасьць мэліярацыйнага будаўніцтва бліжэйшага пяцігодзьдзя, у якое мы па сутнасьці ўступілі. Ёсьць усе падставы разьлічваць, што намечаная пяцігодка будзе поўнасьцю выканана.

Якія-ж галоўнейшыя дасягненьні ў галіне мэліярацыйнага будаўніцтва на дзень 9 гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў?

На працягу 2-х з лішнім гадоў саюзны ўрад ухваліў тры надзвычайна важныя пастановы адносна мэліярацыі ў БССР.

1. Аб прызнаньні за беларускай мэліярацыяй агульнасаюзнага значэньня; 2. Аб прыняцьці мэліярацыйна-гідратэхнічных работ на агульнасаюзны бюджэт; 3. Аб разьвіцьці работ па ўнутрырэспубліканскай калёнізацыі на балотах і аб прыняцьці гэтых работ на агульнасаюзныя сродкі. Гэтыя пастановы забясьпечваюць самае інтэнсыўнае разьвіцьцё мэліярацыйнага будаўніцтва.

Зараз будаўніцыя работы вядуцца ў наступных мясцох: 1. Мар'інскія калфонды ў басэйне ракі Арэсы, Бабруйскае акр.; 2. Паганянскі калфонд, Гомельскае акр.; 3. калфонд Абрубы-Чысьцік, Аршанскае акр.; 4. калфонд на Асьвейскіх балотах Полацкае акр.; 5. калфонд на Тальцы, Менск. акр. На апошніх 4-х калфондах вядуцца толькі мэліярацыйныя работы. **На Мар'інскім калфонде праводзіцца ўжо засяленьне.** Акрамя арганізаванага саўгасу імя «10-цігодзьдзя БССР», у гэтым годзе будуць там арганізаваны 4 калектывы, з іх 2 (чырвонаармейскі і яўрэйскі) ужо зараз прыступілі да работы. К канцу данага апэрацыйнага году на Мар'інскім калфондзе будзе засеяна каля 2.000 гэктараў, за адзін год у адным будзе зроблена больш, чым па ўсёй БССР за час з 1925 па 27 год (1.505 гэктар) у мэліярацыйных таварыствах.

На гэты час на Мар'інскім балоце ўжо засеяна 300 гэктараў розных культур і ёсьць зусім здавальняючыя ўсходы.

З Масквы прыбылі 2 прадстаўнікі Ільнапенькатрэсту з мэтай вывучэньня Мар'інскага будаўніцтва і перанясеньня вопыту гэтага будаўніцтва ў іншыя месцы нашага Саюзу. З 15 трактараў, якія працуюць на балотах, мяркуецца арганізаваць першую Беларускую машына-трактарную станцыю. У галіне арганізацыі і канкрэтнага правядзеньня калёнізацыйных мерапрыемстваў на балотах Беларусь заняла першае месца ў Савецкім Саюзе.

На Мар'інскіх балотах разгортваюцца грандыёзныя работы ўсесаюзнага значэньня.

У рабоце мэліярацыйных таварыстваў трэба адзначыць той факт, што цэлы рад таварыстваў уступілі ў пэрыяд **гаспадарчае эксплёатацыі мэліяраваных плошчаў.** Калі раней ішлі галоўным чынам асушальныя работы, дык зараз насельніцтва мае ўжо канкрэтную карысьць ад мэліярацыі ў відзе ўраджаяў тых ці іншых культур. Трэба сказаць, што ў гэтым годзе ў вялікай большасьці таварыстваў ёсьць надзвычайна добрыя ўраджаі, якія даходзяць да 400 пудоў і вышэй культурнага сена з гэктара. Наяўнасьць добрых ураджаяў не на паказальных вучастках плошчаю ¹/₅ гэктара, а на гаспадарчых плошчах, робіць надзвычайна спрыяючае ўражаньне на насельніцтва, пераконвае яго ў правільнасьці правадзімых мерапрыемстваў і дапамагае калектывізацыі насельніцтва, занятага ў мэліярацыйным будаўніцтве. **Інж. РАШЭТНІКАЎ.**

ПІЯНЭРЫ НОВАЙ ВЁСКІ

Два гады працы сялянскага унівэрсытэту

1-га мая 1927 году, у дзень вялікага сьвята рабочых і працоўных сялян, пры Беларускай дзяржаўнай с.-г. акадэміі ў Горках, па ініцыятыве бюро ячэйкі КП(б)В, пры актыўным удзеле грамадзкіх арганізацый акадэміі, быў адкрыты нядзельны сялянскі унівэрсытэт.

Зразумела, не патрабуе асобных разважаньняў тая роля, якую набывае сялянскі унівэрсытэт на шляху рэканструкцыі калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Прайшло два гады працы сялянскага унівэрсытэту. Зараз ужо можна падвесьці некаторыя вынікі двухгадовай працы.

У 1927 годзе было залічана ў склад слухачоў сялянскага унівэрсытэту 110 асоб, але першыя-ж крокі працы паказалі некаторы адсеў. З пачатку першага навучальнага году прыступіла да працы 80 слухачоў. У склад гэтых сялян уваходзіла беднякоў 20 проц., батракоў — 4 проц., жанчын — 12 проц., членаў ЛКСМВ — 12 проц., сераднякоў —самастойных гаспадароў — 52 проц.

З гэтых невялічкіх лічбаў ужо відаць, каго абслугоўвае сялянскі унівэрсытэт, гэта батракі, бяднейшая і сераднякская частка сялянства, што самастойна вядзе гаспадарку.

На другі курс было пераведзена 48 асоб, з якіх працавалі ўвесь другі год і за раз будуць выпушчаны **толькі 38.** Такі на першы погляд вялікі процант адсеву тлумачыцца тымі асаблівымі труднасьцямі, з якімі зьвязана праца ў сялянскім унівэрсытэце.

Трэба адзначыць, што вёскі і пасёлкі, жыхары якіх зьяўляліся слухачамі сялянскага унівэрсытэту знаходзяцца на адлегласьці ў сярэднім 5-10 кілёмэтраў ад акадэміі. Вялікую ўпартасьць, імкненьне і энэргію трэба праявіць, каб кожны тыдзень у нядзелю прабірацца па тэй асеньняй бездарожжы, па тэй гразі, якімі да гэтага часу яшчэ слаўны Горацкі раён, каб узімку (асабліва ў гэтым годзе) плесьціся на сьнезе, пры 30 градусах марозу, не прапушчаючы ніводнага тыдню, наведваць заняткі.

Мала таго. На вялікі жаль, да гэтага часу сялянскі унівэрсытэт, існуючы дзе гады, ня мае свайго асобнага памяшканьня. Сялянскі унівэрсытэт да гэтага часу карыстаецца памяшканьнямі акадэміі, слухачом нават недзе адпачыць пасьля вучобы.

Выпуск гэтага году ў ліку 38 асоб паказвае, якую зацікаўленасьць праяўляе сялянства да працы сялянскага унівэрсытэту.

38 выпускнікоў — гэта тыя піянэры, тыя ўпартыя, энэргічныя барацьбіты, якія на працягу двох год добраахвотна, ня гледзячы на даволі цяжкія ўмовы працавалі над прыстасаваньнем навуковых ведаў, якія даваліся сялянскім унівэрсытэтам, да вытворчасьці, да сваёй гаспадаркі. Аб тым, што гэтыя веды ня толькі «даваліся», але і «браліся», аб тым, што двохгадовая зарадка не прайшла дарэмна ясна сказала калектыўная праверка ведаў, іспыты, якія былі праведзены ў канцы чэрвеня.

Трэба тут-жа дадаць, што тыя-ж 80 асоб, якія былі прыняты ў 1927 годзе, мелі да сялянскага унівэрсытэту наступную асьвету: скончыла дзьвёхклясавую школу 8 проц. народную і царкоўнапрыходзкую — 76 проц., ня скончылі пачатковай школы 16 проц.

Вось асобныя водзывы членаў камісіі, выкладчыкаў сял. унівэрсытэту, навуковых прадстаўнікоў акадэміі.

Праф. Бурштэйн М. І. — выкладчык сялянскага унівэрсытэту па садоўніцтве і гародніцтве.

«Адказы слухачоў па ўсіх запытаньнях былі станоўчыя і прадуманыя і зьдзіўлялі ўпэўненасьцю ў сваіх ведах і практычнасьці. Скончыўшыя сялянскі унівэрсытэт бязумоўна зьявяцца актыўнымі працаўнікамі - калектывізатарамі, лепшым актывам на вёсцы».

Асыстэнт Бердзін А. І. — выкладчык сял. унів. па зямляробстве: «Асноўныя палажэньні тэхнікі паляводзтва слухачамі сялянскага унівэрсытэту ўцямлены добра. Адказы на асноўныя пытаньні па галінах апрацоўкі і ўгнаеньня глебы даваліся бойка і правільна. Відаць, што акрамя лекцый слухачы унівэрсытэту пазнаёміліся і з асноўнай літаратурай па сельскай гаспадарцы. Наогул уражаньне вельмі добрае».

Слухачы, якія скончылі ў гэтым годзе курс сялян.унівэрсытэту, у недалёкай будучыне паедуць за кошт сялян. унівэрсытэту ў экскурсію па некаторых калгасах і саўгасах БССР. Пасьля таго заняткі С.У. на летні пэрыяд спыняюцца, а ўвосень гэтага году будзе зроблен урачысты выпуск. Адначасова з тым будзе праведзен новы набор слухачоў на І курс.

Але ні ў якім разе ня трэба лічыць, што ў селяніна, які скончыў С. У., тым самым парушаецца сувязь з акадэміяй. Яшчэ на працягу двох гадоў навучаньня, кожны год, улетку, спэцыяльны агранам - інструктар наведае ў гаспадаркі слухачоў і дапаможа рознымі парадамі, закладкай і правядзеньнем дасьледча-паказальных мерапрыемстваў. У мінулым 1928 годзе, такім чынам, былі пастаўлены досьледы ў 18 гаспадарках. У гэтым годзе ўжо на сёньняшні дзень заложана яшчэ 16 досьледаў. Гэтыя дасьледча-паказальныя мерапрыемствы, па водгуках саміх сялян, пашыраюцца і на іншыя гаспадаркі. Пераважная частка скончыўшых сялян пераходзіць у інстытут дасьледчыкаў пры Горацкай станцыі, і такім чынам сувязь з акадэміяй і С. У. будзе падтрымлівацца і надалей. **К. ЗАГОРСКІ.**



Вялікі крок наперад

Спадчына нямецкіх і польскіх акупантаў

Канец 1920, пачатак 1921 году—быў часам найбольшага заняпаду прамысловасьці БССР. У часе імпэрыялістычнай вайны абсталяваньне значнай часткі прадпрыемстваў было вывезена за межы БССР—эвакуявана па распараджэньні царскай улады. Нямецкія акупанты рабавалі астатняе з абсталяваньня, рабавалі асабліва каляровыя матэрыялы. Палякі ў часе адступленьня палілі і ўзрывалі тыя фабрыкі, якія яшчэ працавалі пры польскай акупацыі. Нарэшце, ад прамысловасьці Беларусі засталося вельмі мала, нават ад таго мала што прадстаўляла яна сабой у даваенны час.

Агульнае цяжкое эканамічнае становішча савецкіх рэспублік зараз-жа пасьля грамадзянскай вайны не давала магчымасьці прыступіць да пырокага аднаўленьня прамысловасьці. Яно пачалося толькі ў сярэдзіне 1921 году з пачаткам НЭП'у, калі былі арганізаваны заводакіраўніцтвы асобных прадпрыемстваў і камбінатаў, а ўвесь апарат ВСНГ, налічваўшы больш 1.000 супрацоўнікаў, быў скарочаны і рэарганізаваны. Сапраўдная вытворчая праца на зьбіраньні абсталяваньня і аднаўленьні прадпрыемстваў пачалася толькі к канцу 1921 г.

Тэмп сацыялістычнага будаўніцтва

За 6-7 год, што прайшлі з гэтага часу, прамысловасьць БССР дасягнула значных посьпехаў. Адбудоўчы пэрыяд скончыўся праз пяць год—у 1926-27 гаспадарчым годзе.

Пэрыяд рэканструкцыі, які пачаўся, характарызуецца значным павялічэньнем сродкаў па капітальным работы на прамысловасьці ВСНГ, што відаць з наступных лічбаў: у 1925-26 г. было асыгнавана на капітальныя работы 5 мільёнаў рублёў (акруглена), у 1926-27 г. 10 мільён. рублёў, у 1927-28 г.—17 млн. руб., у 1928-29 г.—25 мільёнаў руб. (без Асінбуду і фабрыкі штучнага валакна), прычым удзельная вага новага будаўніцтва павялічвалася з году ў год: 25-26 г.—12%, 26-27 г.—40%, 27-28 г.—50%, 28-29 г.—54%.

Гэткі рост укладаньняў у прамысловасьць дазволіў павялічыць за апошнія гады амаль удвая асноўны капітал беларускай прамысловасьці.

120 прадпрыемстваў, 32.500 рабочых

У выніку праробленай працы па аднаўленьні прамысловасьці і першых крокаў рэканструкцыі яе, сучасная становішча характарызуецца наступным: 120 дзейных прадпрыемстваў, колькасьць рабочых на 1 ліпеня 1929 г. 32.500 чалавек, рост прадукцыйнасьці працы, непрарыўны рост заработнай платы рабочых і паляпшэньне, у асноўным, іншых ясных паказальнікаў.

Некаторыя прадпрыемствы пераведзены на 7-гадзінны рабочы дзень і на працягу гэтага месяца будуць працаваць скарочаны рабочы дзень 4 новых прадпрыемстваў («Меншвэй», алянтарэйная ф-ка, Х-Кастрычнік і «Днепроўская мануфактура») з колькасьцю рабочых каля 3.000 чалавек, пры поўным наборы. На чарзе пуск на сем гадзін Бабруйскага дрэваапрацоўнага камбінату, «Чырвонай Бярэзіны» (новай).

Прадукцыя прамысловасьці, падпарадкаванай ВСНГ БССР, павінна дасягнуць у гэтым годзе 170 мільёнаў руб., сабекошт прадукцыі мае быць зьніжан на 7%, прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 20% (такім чынам, за 7 і 20, а не за 7 і 17, як пішуць, чамусьці, нашыя беларускія газэты).

Першы год пяцігодкі

Выкананьне пляну бягучага году, першага году пяцігодкі, патрабуе значнага напружаньня творчых сіл пралетарыяту, павышэньня палітычнай сьвядомасьці, працоўнай дысцыпліны, зьмяншэньня прагулаў, далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва. Красавік месяц даў лепшыя паказаньні ў працы нашае прамысловасьці, ён характарызуецца таксама і зьмяншэньнем прагулаў. Аднак, май месяц пагоршыў паказальнікі асабліва **па прагулах, якія павысіліся.** Тлумачыцца апошняе тым, што частка рабочых сьвяткавала рэлігійныя сьвяты («вялікдзень»), што сьведчыць аб недастаткова разгорнутай палітычнай і культурна-масавай працы, у прыватнасьці антырэлігійнай. Антырэлігійнікам, сабраўшым і з'арганізаваўшым вялікую армію ў выніку апошніх зьездаў, трэба (дый пара) заняцца **канкрэтнай** аздараўляючай працай на прадпрыемствах.

Супроць „петніх" настрояў

Разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва павінна ісьці наперад неаслабным тэмпам. Задача зьнікэньня сабекошту і ўздыму прадукцыйнасьці працы (за 7 і 20%) **павінна быць выканана.** Тыя недахопы, якія выявіліся ў пачатку правядзеньня сацыялістычнага спаборніцтва, якія адзначаны пастановай пленуму ЦКПСВ і загадам па ВСНГ, неабходна ліквідаваць у найхутчэйшы час. Асабліва трэба павесьці барацьбу **супроць «петніх» дэмабілізацыйных** настрояў, якія ў апошні момант выяўляюцца на некаторых прадпрыемствах і адмоўна адбіваюцца на правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва.

Плян будаўніцтва—на першы плян

Найбольшая ўвага рабочае клясы павінна быць зьвернута на выкананьне пляну будаўніцтва. У гэтым годзе прамысловасьць значна больш падрыхтавана да будаўнічага сэзону, мае больш вопыт. Аднак, перашкод сустракаецца шмат. Выяўлены недахват цэглы, пры агульным здавальняючым сэзонным балансе, патрабуе з боку будаўнічых арганізацый устанаўленьня каляндарнай чаргі асобных будаўніцтваў у суадпаведнасьці з выпускам цэглы. Патрэбна надзвычайная прадуманасьць з боку будаўчых і будаўнічых арганізацый да выкананьня пляну набудовы тых **звыш двох дзесяткаў** прадпрыемстваў, якія мы пачынаем у бягучым годзе. Самакрытыка ў гэтым напрамку павінна быць узмоцнена, асабліва з якаснага боку.

Трэба памятаць, што ад выкананьня праграмы бягучага году ў значнай частцы залежыць выкананьне пяцігадовага пляну разьвіцьця прамысловасьці БССР.

На грунце, які закладваецца ў гэтым годзе, будзе ісьці разгортваньне грандыёзнага пляну будаўнічых работ, намечаных пяцігодкай. Ад прыбыткаў прамысловасьці, якія зьвязаны са зьнікэньнем сабекошту, залежыць ажыцьцяўленьне праграмы разьвіцьця прамысловасьці з боку фінансаваньня. Рацыяналізацыя, рабочае вынаходзтва, рэканструкцыя—павысяць тэхнічны ўзровень нашае прамысловасьці.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі

Вялікі крок наперад павінна зрабіць Беларусь, выконваючы пяцігодку. Значныя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве, якія дасягнуты на працягу апошніх год, яшчэ больш павялічацца ў далейшым, пры ўзмацненьні кіруючай ролі прамысловасьці.

Падводзячы вынікі сацыялістычнага будаўніцтва з часу пачатку аднаўленьня, ставячы перад сабой новыя грандыёзныя задачы ў далейшым сацыялістычным будаўніцтве, трэба памятаць, што посьпехі аднаўленьня і магчымасьці далейшага разьвіцьця зьвязаны з фактам існаваньня савецкае ўлады, з кіраўніцтвам рабочай клясай з боку камуністычнай партыі.

Пераваг нашай сыстэмы, зьнішчэньне буржуазіі—нацыяналізацыя фабрык і заводаў, нацыяналізацыя зямлі, планавасьць, манаполія замежнага гандлю, забясьпячэньне магчымасьцяй творчай ініцыятывы і самакрытыкі з боку шырокіх працоўных мас, і ў першую чаргу рабочае клясы—вось той грунт, які даваліе нам, перамагаючы труднасьці, упэўнена і бадзёра ісьці на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Ул. СТРАКОЎСКІ.

НА КРУТЫМ УЗДЫМЕ

9 год культурнага будаўніцтва ў БССР

Толькі 9 год назад прыступіла БССР да культурнага будаўніцтва.

Белапанскія акупанты пакінулі пасьля сябе вельмі цяжкую спадчыну. Польская акупацыя прывяла стан народнай асьветы да поўнага заняпаду. Школьныя будынкі былі разбураны, мэбля паламана, культурна-асьветныя працаўнікі былі раскіданы па ўсім шырокім абшары былой імпэрыі, не хапала навучальных прылад.

Русіфікатарская палітыка былой царскай улады, вельмі невялікая колькасьць школ для абслугоўваньня шырокіх колаў працоўнага насельніцтва, нацыянальная абмежанасьць і вялікая ніпісьменнасьць давалі ад сабе ведаць на кожным кроку культурнага будаўніцтва.

За мінулыя 9 год савецкая ўлада дасягнула вялізных посьпехаў у ліквідацыі спадчыны царызму, імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны, у пабудове беларускай і іншых культур.

Асабліваю ўвагу была ўдзелена разьвіцьцю **масавай, народнай асьветы.** Тут паставлена была ясная мэта—**ажыцьцявіць да 1934 г. усеагульнае абавязковае навучаньне.** Кожны год адкрываюцца сотні новых школьных камплектаў, будуюцца новыя і капітальна рамантуюцца старыя школьныя будынкі. Лік дзяцей ва ўзросьце ад 8 да 11 год, ахопленых пачатковай школай, за 9 год павялічыўся з 63 да 85 (на 1000 душ насельніцтва); да канца пяцігодкі ўсе дзеці ад 8 да 11 год павінны быць ахоплены школай. Разам з колькасным павялічэньнем школьнай сеткі паступова паляпшаецца і якасьць іх: колькасьць аднакамплектных школ зьменшылася з 80 да 68 проц., кошт утрыманьня аднаго кампдекту павялічыўся з 616 руб. у 1925-26 г. да 855 у гэтым, значна палепшылася забесьпячэньне школ пісьмовымі прыладамі і падручнікамі.

Перад намі яшчэ вялікія задачы. Трэба пабудаваць новыя будынкі для 45-50 проц. існуючых школ і для нановаа адкрытых, капітальна адрамантаваць яшчэ 52 проц. існуючых школьных будынкаў, падрыхтаваць вялікія кадры настаўнікаў.

Вылучаючы значныя матар'яльныя сродкі на разьвіцьцё начатковай асьветы, беларускі ўрад не забываў і аб **сярэдняй.** Ахоп дзяцей старэйшага ўзросту старшым канцэнтрам сямігодкі паступова павялічваецца: у 1921-22 г. гэты процант хістаўся паміж 6,5-7 проц., у 1924-25 г. ён павялічыўся да 8 проц., зараз ён дасягае 11-12 проц.

Вялікае імкненьне сялянскіх дзяцей да павышанай асьветы прымушае адкрываць роўналежныя групы пры сельскіх сямігодках, пры палове апошніх арганізаваны інтэрнаты, да 35 проц. вучняў—дзеці батракоў і беднякоў.

Падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы і тэхнікаў у такой краіне, як БССР, з адсталымі формамі карыстаньня зямлёй, нажуль слаба разьвітай прамысловасьцю, павінна заняць выдатнае месца ў сыстэме народнай асьветы. У гэтай галіне БССР не атрымала ад старога ладу амаль нічэга. Зараз мы маем каля 40 прафшкол, каля 35 тэхнікумаў, 15 школ фабзавучу, каля 10 навучальна-паказальных майстэрань, у якіх навучаецца звыш 10 тысяч чал. Гэта вялікі посьпех у справе індустрыялізацыі краіны і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Сыстэма народнай асьветы прыстасоўваецца зараз і да патрэб калектыўных форм сельскай гаспадаркі. Падрыхтоўка **працаўнікоў калгасаў і камун** зойме належнае месца ў прафтэхнічнай асьвеце.

Асабліва вялікія дасягненьні мае БССР у справе **вышэйшай асьветы.** Як вядома, на тэрыторыі сучаснай Савецкай Беларусі да 1926 г. ня было ніводнай **вышэйшай навучальнай установы.** Урад БССР добра зразумеў, што без падрыхтоўкі належнага кадру высока кваліфікаваных спэцыялістых па ўсіх галінах гаспадаркі і культуры, цяжка разьвіваць эканамічны дабрабыт і культуру ў такой адсталай краіне, як Беларусь. Першы крок Савецкага ўраду пасьля вызваленьня Беларусі быў—**адкрыцьцё Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.**

Зараз па БССР мы маем 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы. Унівэрсытэт і акадэмія ўжо выпусьцілі некалькі тысяч кваліфікаваных спэцыялістых, якія зараз працуюць пад уздымам культуры і гаспадаркі БССР. Значна палепшыўся сацыяльны склад студэнтаў—у ліку прынятых у 1928-29 г. 75,7 проц. рабочых, сялян і іх дзяцей.

Рашучы курс на індустрыялізацыю і рэканструкцыю сельскай гаспадаркі прымушае рыхтаваць спэцыялістых сацыялістычнай прамысловасьці і гаспадаркі. У гэтым годзе адкрываецца хэміка-тэхнічны факультэт пры БДУ і факультэт калектыўных гаспадарак пры с.-г. акадэміі.

У гэтым-жа годзе будуць набудаваны першыя карпусы унівэрсытэцкага гарадка. Пяцігадовы плян прадугледжвае пабудову раду новых навукова абсталяваных будынкаў для нашых ВНУ.

6 месяцаў назад арганізавана **Беларуская Акадэмія Навук;** значна пашырылася і паглыбілася работа навукова-дасьледчага інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі, адкрываецца навукова-дасьледчы прамысловы інстытут. Дасьледчая справа, якая ў Беларусі раней ня была разьвіта, зараз пашыраецца з кожным годам.

Некалькі слоў аб **ліквідацыі няпісьменнасьці.** Лік пісьменных за 9 год павялічыўся амаль на 30 проц. Пяцігадовы плян прадугледжвае поўную ліквідацыю ніпісьменнасьці сярод дарослага насельніцтва і падростка да 1934 г.

Нячуваных посьпехаў, якіх ня мае ні адна краіна ў сьвеце, акрамя савецкіх рэспублік, дасягнула **будаўніцтва нацыянальнай культуры ў БССР.** Досьць сказаць, што ад 70 да 95 проц. пачатковых і сярэдніх школ працуюць на беларускай мове, БССР мае звыш 250 яўрэйскіх школ, звыш 150 польскіх, дзесятак латыскіх і літоўскіх. Мы не гаварым ужо аб польскіх і яўрэйскіх тэхнікумах і аддзяленьнях ВНУ. Працоўныя кожнай нацыі маюць свой тэатр, свой друкаваны орган. Прадукцыя Белдзяржвыдавецтва дасягнула за апошнія 3 гады 25 міл. аркушоў замест 7.

Творчыя сілы працоўных усіх нацыянальнасьцяй БССР, якія былі закаваны у ланцуг і царскай, а потым белапольскай няволі, разбуджаны Кастрычнікавай рэвалюцыяй. Будаўніцтва пралетарскай культуры ўсіх нацый, якія жывуць у Савецкай Беларусі, шпаркімі крокамі ідзе ўперад. **Б.**

ПАНОВАМУ ШУМІЦЬ ПОЛЕ

Шуміць пановаму поле. Імчыцца дзень за дзён. Шчыльна нагружаны работай тыдзень лажыцца адзін на другі, складаючы месяцы і гады... Кожны год мы запамінаем, як слэды прыгожай, блізкай да думак і пачуцьцяў песьні. Вягуць гады. Гады баёў крывавых і слаўных перамог расталі ў новых днёх над грукат будаўніцтва новых фабрык і заводаў, над шум каласістых палёў.

* * *

За паваротам паварот цягнік адстуквае вёрсты. Колы выстукваюць на стыках рэек сваю адвечную песьню. Яна разносіцца між палёў, бы апавядае палявым прасторам пра шумлівы горад, пра грукаты варштатаў фабрык... Слухаюць палі і адчуваюць, што хутка сталёвы конь затарахціць па ўсіх куткох, і зямля зусім зрадніцца, зблізіцца, пад песьні пакаленьняў, з магутнай сталёвай машынай... Адчуваюць ужо гэта палі, шуміць пановаму і калосіцца пад усплескам новых дзён. Рэжа паравоз прастор, выставіўшы чыгунныя грудзі насустрач сэмафору... Прыпыніўся на невялічкім вакзале і далей...

Вакзал тане ў зелені клёнаў і ясеняў. Сонца касымі праменьнямі лягло на стрэхі будынкаў. Мы накіраваліся ў камуну **«Чырвоны Сьцяг» *).** Загарэлы камсамолец Кастусь, нядаўна яшчэ вучань школы сялянскай моладзі, энэргічным рухам рукі паказаў у прастор цёмна-зялёных палёў, па якіх вілася шэрая, як суравое палатно, дарога ў камуну.

— Вось па гэтай дарозе пойдзем. Вёрст пяць ня больш будзе—цепыць нас Кастусь.

Мінаем пасёлак «Чырвоную Горку», падыходзім да камуны. Нібы вялізны прыяемісты куст, прысады шчыльна абступілі будынкі камуны, а два рады маладых ясеняў выцягнуліся ўздоўж дарогі—насустрач падарожнікам.

Пры [illegible] ў сядзібу камуны ўздоўж дарогі выцягнулася мэтраў на сто ў даўжыню і каля 25 у шырыню будынына. З яе пахла сьвежай канюшынай. Троху далей, з другога боку—сьвіран.

— Вось гэта наша гумно, канюшыны ўчора [illegible], а там вось далей сьвіран—паказвае Кастусь.

У камуне зазванілі. Мэталёвыя рэзкія гукі разьнесьліся над прысадамі і пакаціліся, апусьціўшыся на жытнёвым прасторы.

Шумяць пановаму поле. Імчыцца дзень за дзён. Шчыльна нагружаны работай тыдзень лажыцца адзін на другі, складаючы месяцы і гады... Кожны год мы запамінаем, як слэды прыгожай, блізкай да думак і пачуцьцяў песьні. Вягуць гады. Гады баёў крывавых і слаўных перамог расталі ў новых днёх над грукат будаўніцтва новых фабрык і заводаў, над шум каласістых палёў.

* * *

За паваротам паварот цягнік адстуквае вёрсты. Колы выстукваюць на стыках рэек сваю адвечную песьню. Яна разносіцца між палёў, бы апавядае палявым прасторам пра шумлівы горад, пра грукаты варштатаў фабрык... Слухаюць палі і адчуваюць, што хутка сталёвы конь затарахціць па ўсіх куткох, і зямля зусім зрадніцца, зблізіцца, пад песьні пакаленьняў, з магутнай сталёвай машынай... Адчуваюць ужо гэта палі, шуміць пановаму і калосіцца пад усплескам новых дзён. Рэжа паравоз прастор, выставіўшы чыгунныя грудзі насустрач сэмафору... Прыпыніўся на невялічкім вакзале і далей...

Вакзал тане ў зелені клёнаў і ясеняў. Сонца касымі праменьнямі лягло на стрэхі будынкаў. Мы накіраваліся ў камуну **«Чырвоны Сьцяг» *).** Загарэлы камсамолец Кастусь, нядаўна яшчэ вучань школы сялянскай моладзі, энэргічным рухам рукі паказаў у прастор цёмна-зялёных палёў, па якіх вілася шэрая, як суравое палатно, дарога ў камуну.

— Вось па гэтай дарозе пойдзем. Вёрст пяць ня больш будзе—цепыць нас Кастусь.

Мінаем пасёлак «Чырвоную Горку», падыходзім да камуны. Нібы вялізны прыяемісты куст, прысады шчыльна абступілі будынкі камуны, а два рады маладых ясеняў выцягнуліся ўздоўж дарогі—насустрач падарожнікам.

Пры [illegible] ў сядзібу камуны ўздоўж дарогі выцягнулася мэтраў на сто ў даўжыню і каля 25 у шырыню будынына. З яе пахла сьвежай канюшынай. Троху далей, з другога боку—сьвіран.

— Вось гэта наша гумно, канюшыны ўчора [illegible], а там вось далей сьвіран—паказвае Кастусь.

У камуне зазванілі. Мэталёвыя рэзкія гукі разьнесьліся над прысадамі і пакаціліся, апусьціўшыся на жытнёвым прасторы.

— Звоняць на вячэру...

Каля сталоўкі, на дварэ вялікі стол, засела чалавек 10 маладых камунараў. Сярэдніх год кабета клапатліва чэрпала з вялікага бака малако і падавала кожнаму за стол...

— А дзе-ж старыя, чаму гэта адна моладзь вячэрае?—пытаемся ў хлопцаў.

— Старыя павячэралі ўжо, разышліся... На стале поўнае рэшата сьвежага пахучага хлеба...

— У нас проста, але з дастаткам,—гавораць хлапцы,—праўда, трэба-б было нечым замяніць рэшата, але-ж больш пільныя патрэбы ў гаспадарцы ёсьць.

Пачаставаўшы вячэрай, маладыя камунары павялі нас у сваю кватэру, а потым на рэчку. Павольна коціцца па пяшчаным улоньні вада Вусы. Цяпер ціхім ліпнёвым вечарам яна здаецца не цячэ, а застыла ў мяккай цішыні вечара. Шпарка расьце і разьвіваецца камуна.

* * *

Сакратар парт'ячэйкі камуны **т. Сьцефановіч Язэп,** прысеўшы са мной на вялікі жалезны сундук у канцылярыі, расказваў аб гісторыі камуны. Павольна, бы баючыся прапусьціць які-небудзь момант, вёў ён сваё апавяданьне:

— У жніўні 1921 году заснавана гэта камуна... Я быў у ліку тых першых 6 сем'яў, якія прышлі сюды ладзіць гаспадарку.

— Што мы тут засталі? Хаты з выбітымі вокнамі, ніводнай зашчапкі у дзьвярах ня было. Прышлі мы і ўсе пэсьць сем'яў пасяліліся ў адным пакоі. Нястача то таго, то другога. А дзе нястача, там і склокі.

Былі яны і ў нас.

З масмасьці мы засталі: дзьве пары коняй, маленькіх, як авечкі, пару жаробят, адну карову і бугая. Проста ня было на чым выехаць на работу, ня было чаго ў рукі ўзяць, бо плугі, якія засталіся, былі старыя, дзьве бараны так сама. А зямлі нямала—270 дзесяцін, праўда, пад лесам дзесяцін 80, але-ж такім інвэнтаром і цягавай сілай апрацаваць яе было нельга... Але за годам год нас пасоўвалі наперад і цяпер... Цяпер зусім іншае... Цяпер вы самі можаце бачыць, што ёсьць.

Калі мы з т. Сьцефановічам вялі гутарку, седзячы на сундуку, у канцылярыі каля стала сабраліся жонкі вакол двух мужчын і аб чымсьці гаманілі.

— Што нарада якая, ці што?

— Ды не, гэта жонкі даюць заказ мужчынам, што ў мястэчку купіць.

— Нітак сто шпулек запішэце—цьвярдзіла адна з кабет.

— Ды ўжо запісаў нітак, што больш?

Мы пакідаем канцылярыю і нас малады хлапец—камсамолец **т. Латушка** вядзе паказаць маемасьць камуны. Ён член савету камуны і выконвае абавязак загадчыка гаспадаркі. Малады загадчык пералічвае нам усё, пачынаючы ад машын і канчаючы самымі дробнымі рэчамі.

— У нас адзін трактар, малатарня, дзьве касілкі, дзьве жнявяркі, сявярка, бульбакапальнік, 13 коняй рабочых і 2 маладых, 26 дойных кароў і 12 штук падцёлкаў, сьвіней старых каля 60, а разам з маладымі да 100 штук...—нібы дыкляміуе добра завучаны вер[illegible] расказвае нам загадчык гаспадар[illegible]

— А што-ж гэта ня люд[illegible] нічога ня кажаш?—жартуе другі мала[illegible] камунар.

— Можна і пра людзей. Я пра людзей у канцы думаў...

— Людзей у камуне 72 душ

НА ВЫЗВАЛЕНЫХ ПАЛЁХ БЕЛАРУСКІХ...

РЭВАЛЮЦЫЮ У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ БССР ЗРОБЯЦЬ:

- ЖЫТНЯ-ПШАНІЧНЫ ГІБРЫД
- ВЫСОКАЯКАСНЫ ЯЧМЕНЬ
- СКОРАСЬПЕЛЫ ЛУБІН
- КАРМОВЫЯ ТРАВЫ

Усе гэтыя культуры УЖО ВЫГАДАВАНЫ і ВЫПРАБАВАНЫ беларускай станцыяй прыкладное батанікі

Жытня-пшанічны гібрыд дае 200 пудоў збожжа з гэктару на звычайнай сугліністай глебе.—Беларусь заклікана быць цэнтрам вырашчваньня найлепшага экспартнага браварнага ячменю.—На беларускай станцыі прыкладной батанікі сканцэнтравана сусьветная калекцыя лубіну ў мэтах вывучэньня і стварэньня новага гатунку лубіну, які-б у Беларусі даў ня толькі высокі ўраджай зялёнай масы, але і зусім сьпелае насеньне.—Станцыя нападзіла сувязь з сялянамі-дасьледчыкамі, лік якіх перавышае 400.

Галоўны корпус Беларускай станцыі прыкладной батанікі ў Лошыцы.

1. Пад скромнай шыльдай

Гэтымі днямі мне давялося, згодна парады наркамзема БССР, азнаёміцца з работаю ўстановы, якая носіць досыць скромную навуковую назву: «Беларуская станцыя Усесаюзнага Інстытуту Прыкладное Батанікі і Новых культур».

Я паехаў з вялікай неахвотаю і з яшчэ меншай надзеяй раздабыць штонебудзь цікавае.

Павінен прызнацца, што глыбока памыліўся. Тое, што я ўбачыў па гэтай станцыі (былы саўгас Лошыца 1-я, 5 вёрст ад Менску), мяне зьдзівіла. Я трапіў у такое месца, дзе самыя цьвёрдыя скэптыкі, якія ня бачаць, або ня хочуць бачыць штодзенных дасягненьняў савецкае ўлады і ў прыватнасьці—Савецкай Беларусі, не маглі-б ня зьдзівіцца.

Ня будзе перапавялічэньнем, калі сказаць, што рад нашых важнейшых гаспадарчых мерапрыемстваў, асабліва ў галіне ўзьняцьця сельскае гаспадаркі, маюць зусім мізэрнае значэньне ў параўнаньні з тымі магчымасьцямі, якія абяцае шырокае практычнае ўжываньне навуковых вынікаў гэтай дасьледчай станцыі. **Іменна тут заложаны сакрэт шпаркага ўзьняцьця ўраджайнасьці беларускіх палёў.** Такое азначэньне на ўсе 100 проц. адпавядае значэньню Беларускай Станцыі Усесаюзнага Інстытуту Прыкладное Батанікі.

Перш, чым падзяліцца тым, што бачыў на станцыі, я дазволю сабе перадаць тое, што мне палічылі патрэбным, яшчэ да азнаямленьня з палямі, расказаць навуковым працаўнікі станцыі аб гісторыі яе ўзьнікненьня і яе задачах.

Побач з нястомнымі клопотамі аб агульнай перабудове ўсяго ўкладу жыцьця саюзу працоўных, Ільліч асабліва былі блізкі клопаты аб абнаўленьні і ўзьняцьці на адпаведную вышыню нашага зямляробства. Ленін у пошуках літаратуры на даным пытаньні спыніў сваю ўвагу на невялікай кніжцы амэрыканца Гарвуда «Абноўленая зямля», дзе апісваліся посьпехі амэрыканскага зямляробства. Гарвуд паказвае чытачу вялізную, дзікую, некультурную краіну, пакрытую першабытнымі лясамі і степамі. Такою была Паўночная Амэрыка ўсяго каля 75 год таму назад. Пад цудоўным уплывам амэрыканскага дэвізу «я хачу», краіна шпарка пашла наперад на шляху разьвіцьця сельскае гаспадаркі. Вялікая колькасьць заснаваных сельска - гаспадарчых дасьледчых станцый пачала палепшаць жывёлу, гатункі насеньня, уводзіць у сельска-гаспадарчую культуру зусім новыя расьліны, змагацца з эпідэміямі, вышукваць новыя прыёмы апрацоўкі зямлі. У выніку — сельска-гаспадарчая прадукцыя Паўночнай Амэрыкі нячувана шпаркім тэмпам вырасла.

Стварэньне ў 1923 годзе ў Ленінградзе Усесаюзнага Інстытуту Прыкладное Батанікі і новых культур і зьявілася першым практычным крокам на шляху да ажыцьцяўленьня ідэі Ўладзімера Ільліча — ідэі перабудовы нашага зямляробства.

Увесну 1926 году ў Лошыцы арганізуецца Беларускае аддзяленьне інстытуту, зараз перайменаванае ў Беларускую станцыю. Гэта станцыя пачынае весьці сваю работу ў поўнай адпаведнасьці з агульнымі задачамі цэнтральнага інстытуту і прыродна-гістарычнымі і геаграфічнымі ўмовамі Беларусі. Беларуская станцыя, пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Інстытуту, зварачае асаблівую ўвагу на пытаньні абнаўленьня старых і стварэньня новых, больш каштоўных, сельска-гаспадарчых культур і гатункаў, якія маюць для Беларусі важнае значэньне. Станцыя ажыцьцяўляе гэта праз арганізацыю розных рассадніцкаў, пастаянных насаджэньняў і гаспадарчых палёў першапачатковага размнажэньня. З часу арганізацыі Беларускай станцыі мінула каля трох год.

Паколькі мы парашылі прытрымлівацца храналёгічнае пасьлядоўнасьці, пачнем з самага нязначнага, з трускалак, разложаных на двух дзесятках талёрак на стале ў сталовым пакоі дырэктара станцыі тав. Сюбарава. Тут было прадстаўлена толькі некалькі дзесяткаў з больш чым ста гатункаў ягад, што разводзіць станцыя. Паспрабаваўшы ягад, мне прышлося згадзіцца з думкаю тав. Сюбарава, што трускаўкі, якія культывуюцца ў Беларусі, прадаюцца на нашых рынках і называюцца ананасныя, у сапраўднасьці адзін з самых дрэнных гатункоў і што «ананасныя» яны называюцца, як відаць, таму, што прадаюцца ня зусім сьпелымі, яшчэ зялёнымі. Да паслуг-жа беларускіх сялян і гароднікаў ёсьць, аказваецца, на станцыі гатункі сапраўды дасканалых сакавітых, смачных салодкіх ягад.

2. Аб гібрыдзе, які зробіць рэвалюцыю

З тав. Сюбаравым і навуковымі супрацоўнікамі накіроўваемся мы на дасьледчыя палі. Перад нашымі вачыма раскінулася шмат вучасткаў велічынёю ця квадратовага мэтру кожны, засеяных самымі рознастайнымі культурамі. Калі-б не спэцыяльная дошчачка перад кожным вучасткам а надпісам і нумарам, дык, зразумела, нельга было-б разабрацца ў гэтым моры культур нават спэцыялістаму.

Нас знаёмяць з палявымі культурамі. Падыходзім да аднаго з самых важных і цікавых у нашых умовах дасягненьняў станцыі, да культуры **жытня-пшанічнага гібрыду.** Гэта, аказваецца, новая форма расьліны, новы хлебны прадукт, атрыманы рукамі чалавека пры дапамозе злучэньня жыта і пшаніцы. Значэньне работы станцыі ў галіне вывучэньня жытня-пшанічнага гібрыду для Беларусі вялізнае. Жыта ў нашых умовах дае ў сярэднім ня больш 40-50 пудоў з гэктара, а слабыя посьпехі ў галіне прарастаньня пшаніцы як ярыцы, так і азімкі, агульна-вядомыя. Навуковыя дасьледчыя станцыі ва ўсім сьвеце доўгі час біліся над атрыманьнем жытня-пшанічнага гібрыду, які можа таксама, як і жыта, пераносіць нашу зіму і ў той-жа час мае дасканалыя таварныя якасьці паўднёвае пшаніцы.

Жытня-пшанічны гібрыд быў атрыман у натуральных умовах на Саратаўскай дасьледчай станцыі ў 1921 годзе. Гэтаму дапамагалі кліматычныя ўмовы на паўднёвым усходзе — у той час быў сухмень. Гібрыд фактычна атрымаўся ў натуральных абставінах: пшаніца апылілася пылам жыта. Штучна атрымаць такое злучэньне надзвычайна цяжка.

Некалькі зярнят гэтага гібрыду было потым перадана Саратаўскай станцыяй Маскоўскаму аддзяленьню Інстытуту Прыкладное Батанікі. У 1927 годе Беларуская станцыя атрымала ўсяго некалькі кілёграм насеньня жытня-пшанічнага гібрыду. Гібрыд быў упяршыню засеяны на маленькай плошчы дасьледчага поля. Вынікі былі ўдалыя. На другі год Беларуская станцыя робіць тую-ж практыку, але ўжо ў больш шырокім разьмеры. Вынік дасканалы. Зараз станцыя засявае такім чынам гэты гібрыд ужо трэці раз. Плошча, занятая сёлета пад гібрыдам, не малая—2 гэктары. Ураджаньне ад гэтага вучастку, на якім вырасла густая, велічынёю з чалавека, сьцяна, калі можна так сказаць, помесі жыта і пшаніцы — зьдзіўляючае. Тав. Сюбараў паведамляе нам, што **гэктар гэтых поўнакроўных, вялізных каласоў гібрыду дае каля 200 пудоў ураджаю збожжа. І гэта на звычайнай сугліністай глебе, характэрнай для большай часткі Беларусі.** Такі вынік дасягнут бяз усякае спэцыяльнае апрацоўкі глебы, без ужываньня перавышанае нормы ўгнаеньня — **усё гэта зроблена так, як у звычайнай беларускай сялянскай гаспадарцы.** Калі да гэтага дадаць, што спробны размол жытня-пшанічнага гібрыду даў надзвычайна добрае якасьці белую муку, а з выпечанае мукі былі дасканалыя белыя булкі, дык стане ясным, **якія вялізныя пэрспэктывы дае нам перанясеньне практыкі засеваў жытня-пшанічнага гібрыду з маленькага вучастку Беларускай станцыі на шырокія палі беларускіх саўгасаў, калгасаў і шматлікага індывідуальнага сялянства.**

У даным выпадку, калі я гавару пра пэрспэктывы, дык гэта ня трэба разумець, як нешта далёкае, што можа быць праведзена ў жыцьцё толькі праз дзесяткі гадоў. Якраз наадварот, ужо ў гэту восень гібрыт пачне завяёўваць свае правы на гаспадарчых палёх саўгасаў і калгасаў. Зьняўшы ўраджай, станцыя частку збожжа перадасьць апошнім для засеву. Гэта будзе, зразумела, гібрыдная кропля ў моры засеваў нашай беларускай шматгатунковай пшаніцы і жыта.

Усё гэта, зразумела, не гаворыць, што атрыманы жытня - пшанічны гібрыд зьяўляецца дасканаласьцю, дый самую ўдасканаленую культуру можна без канца палепшаць. Гібрыд мае адзін недахоп: яго ніжняя лісты ўжо зараз жаўцеюць, таксама як і лісты нашага жыта і пшаніцы. У нашых умовах, калі мы патрабуем ад саломы добрых кармовых якасьцяй, і такі недахоп мае сваё значэньне. Беларуская дасьледчая станцыя лічыць таму сваю работу з гібрыдам незакончанай. Яе навуковыя працаўнікі паставілі сабе задачай абавязкова дабіцца такога жытня - пшанічнага гібрыду, які даў-бы салому добрае кармовае якасьці.

Гэты недахоп жытня-пшанічнага гібрыду не зьмяншае, зразумела, яго вялізнага значэньня. Здавальняемся-ж мы нашым малаўраджайным жытам і пшаніцаю, якая дае ўсяго 40-50 пудоў з гэктара. Дык чаму-ж не прасунуць у жыцьцё высокаўраджайны гібрыд, які дае 200 пудоў з гэктара?

Можна з упэўненасьцю сказаць, што іменна жытня-пшанічнаму гібрыду давядзецца зрабіць рэвалюцыю ў збожжавай гаспадарцы Беларусі. Калі гэта рэвалюцыя адбудзецца — пытаньне на 99 проц. залежыць ад нас самі х.

3. Будучына за „нэгрыцянскім" ячменем

Калекцыя таварных ячмянёў — гонар Беларускае станцыі. Знаёмячы нас з дасягненьнямі станцыі ў галіне вывучэньня культуры ячменю, дырэктар станцыі прачытаў перад гэтым маленькую лекцыю, без якое сапраўды цяжка было-б зразумець значэньне гэтай культуры для Беларусі, дзе яна адыгрывае зараз параўнаўча нязначную ролю.

Навука давяла, што якасьць сельска-гаспадарчых расьлін у большасьці выпадкаў залежыць ад натуральна-кліматычных умоў месца іх прарастаньня. Лепшыя ў сьвеце, напрыклад, цьвёрдыя экспартныя гатункі пшаніцы растуць на паўднёвым усходзе Савецкага Саюзу. Аднак, апрача пшаніцы мы экспартуем таксама і іншыя сельска-гаспадарчыя культуры, як напрыклад, ячмень. Па культуры ячменю Савецкі Саюз ня мае сабе роўных. Дарэвалюцыйная Расія займала на сусьветным рынку ячменю першае месца. Трэцяя частка сусьветнага збору ячменю прыпадае на Савецкі Саюз; у экспарце-ж СССР ячмень сярод іншых экспартуемых збожжавых культур займае другое месца. Ці можна павялічыць экспарт ячменю і ў прыватнасьці экспартаваць у большай колькасьці ячмень з Беларусі?

Усе ячмені падзяляюцца на дзьве групы: на кармавыя і броварныя. Асноўная розьніца гэтых дзьвюх груп ячменю заключаецца ў хэмічным складзе іх зерня. Кармавы ячмень, як і пшаніца, павінен мець найбольшую колькасьць бялку, які ідзе на пабудову ткані арганізму чалавека і жывёлы. Такі ячмень расьце ў сухіх раёнах СССР.

Броварны ячмень адзначаецца якраз адваротнымі ўласьцівасьцямі. Да добрага броварнага ячменю прад'яўляюцца наступныя два патрабаваньні: менш бялкоў, больш крухмалу. Вядома, што ліпшак пагоршвае працэс бушаваньня піва і якасьць апошняга.

За граніцай цана на броварны ячмень вымяняецца ў залежнасьці ад бялкоў у ім. 8-12 проц. зьяўляюцца гранічнымі, вышэй або ніжэй якіх колькасьць бялка лічыцца нежаданай.

У дарэвалюцыйны час нават броварны ячмень, вывезены з-за межаў Расіі, распэньваўся значна ніжэй, як замежны. Расія траціла мільёны рублёў — віною гэтага была нізкая якасьць ячменю.

Навуковыя дасьледваньні ўзьнікшых пасьля рэвалюцыі ў Савецкім Саюзе дасьледчых станцый, паказалі, што ў СССР ёсьць такія раёны, дзе з посьпехам можа расьці першаклясавы броварны ячмень, які па сваёй якасьці ня горшы ад лепшых загранічных гатункаў ячменю. Практыка паказала, што ў ліку такіх раёнаў **Беларусь займае першае месца.** Гэта пацьвярджаюць наступныя даныя прафэсара Усесаюзнага Інстытуту Прыкладное Батанікі і Новых культур **Н. Н. Іванова.** Адны і тыя-ж гатункі ячменю, засеяныя ў розных раёнах Савецкага Саюзу, далі такі склад бялка: у Беларусі — 10,5 проц., у Маскве — 13,8 проц., на паўднёвым усходзе — 20,1 проц., у Кіеве — 17,1 проц., у Адэсе — 19,2 проц., у Ташкенце — 18,5 проц. Такім чынам, Беларусь заклікана быць цэнтрам вырошчваньня экспартнага броварнага ячменю.

Досьледы з ячменем Беларуская станцыя змагла разгарнуць толькі ў 1928 годзе, калі ў яе распараджэньне кіраўніком Усесаюзнага Інстытуту Прыкладное Батанікі і новых культур, акадэмікам Н. І. Вавілавым, быў перадана ўвесь экспэдыцыйны матар'ял, які ён сабраў у розных раёнах Афрыкі.

Маючы самую каштоўную ў сьвеце калекцыю броварнага ячменю, маладая Беларуская станцыя энэргічна ўзялася за работу. Яна правяла «спаборніцтва» ячмянёў самага рознастайнага геаграфічнага паходжэньня, якое дало магчымасьць вызначыць якасьць і недахопы звыш 1.000 гатункаў ячменю. У «конкурсе» прынялі ўдзел ячмені розных раёнаў СССР, Беларусі, Заходняй Эўропы, Азіі, Афрыкі (між іншым, у досьледах прынялі ўдзел 423 гатункі беларускага ячменю). Было праведзена звыш 300 аналізаў «удзельнікаў конкурсу» на хэмічным складзе, абсалютнай вазе, засьмечанасьці, гатунковасьці і батанічным складзе. Што-ж вышла? **Беларускія гатункі ячменю,** якія маюць найлепшыя ва ўсім Савецкім Саюзе ўмовы для свайго прарастаньня, **адзначыліся некаторымі недахопамі:** вялікая засьмечанасьць, кепская ўсхожасьць, нізкая абсалютная вага, адсутнасьць вытрыманых адпатыповых гатункаў.

Беларуская станцыя прышла, аднак, да другога выводу: **усе гэтыя недахопы можна зжыць; Беларусь можа стаць раёнам росту найлепшага** экспартнага **ячменю.** Мы пераканаліся ў правільнасьці такога заключэньня сваімі ўласнымі вачыма. На вучастку зямлі станцыі, дзе адзін ля аднаго растуць 2.000 гатункаў ячменю розных краін сьвету, розьніца рэзка відавочная. Асабліва вялікая розьніца паміж мізэрным нізкарослым беларускім ячменем і высокім тлустым абісінскім. Да рэчы, аб «нэгрыцянскім» ячмені з Абісініі, перанесеным да нас на Беларусь. Летась Беларускую дасьледчую станцыю прыкладное батанікі наведаў адзін прыезджы навуковы працаўнік. Убачыўшы абісінскі ячмень, ён ні то са зьдзіўленьнем, ні то з насьмешкаю сказаў:

— Ды што вы ўздумалі прышчапляць трапічны абісінскі ячмень халоднай Беларусі?!

Працаўнікі станцыі прышлі ў замяшаньне. Але затое ўвосень, калі ячмень зжалі, яны пашкадавалі, што маскоўскі скэптык адсутнічае. Умовы нашага краю **моцна зьмянілі** прывозны абісінскі ячмень. У Беларусі ён пачуў сябе **значна лепш,** як на сваёй бацькаўшчыне. А вось і лічбы. **Шматрадковы жоўты абісінскі ячмень, напрыклад, у Беларусі дае на 50 проц. ураджай вышэй, як у Абісініі.** Гэты-ж ячмень, засеяны ў Абісініі, дае бялку 15,39 проц., у Беларусі-ж—толькі 10,45 проц.

Аналёгічныя вынікі дасягнуты станцыяй і пры правядзеньні досьледаў з ячменямі іншых гатункаў.

Усе гэтыя даныя гавораць аб тым, што Беларусь можа даць экспартны ячмень у вялікай колькасьці Гэта пацьвярджаецца, між іншым, досьледам вырошчваньня ў Беларусі чыстагатункавага ячменю пад назвай «Залаты», які ацэньваецца вельмі высока па заграніччных шкалах. «Залаты» ячмень упяршыню быў увезен у Беларусі у 1927 годзе Беларускай Станцыяй Прыкладное Батанікі з Швэцыі. Станцыя, па заданьні Наркамзему, стала размнажаць гэты гатунак для Дзяржнасенкультуры. У выніку ў 1929 годзе беларускія саўгасы ўжо засеялі 24.000 кілёграмы «залатога» ячменю.

Пры ацэнцы ўсіх адзнак «залатога» ячменю, выгадаванага саўгасамі па 16-цібальнай шкале, прынятай у Нямеччыне, аказалася, **што ён стаіць на адным узроўні з нямецкім гатункам** «Ганпагерстэ». Неабходна пры гэтым адзначыць, што ў нас да выстаўкі не рыхтаваліся, а пробу бралі з агульнай масы ўраджаю.

Між іншым, паводле даных апрабацыі Наркамзему, наш ураджай «Залатога» ячменю быў **самым чыстагатунковым** па ўсёй Савецкай Беларусі.

Вялікае ўвагі заслугоўваюць вынікі пасеву «Залатога» ячменю **ў індывідуальных** сялянскіх гаспадарках Беларусі. У 1928 годзе па ўсіх акругах БССР было разаслана 180 пасылак з ячменем. Сяляне засявалі на сваіх палёх гатунак «Залаты» побач з мясцовымі гатункамі. Вось якія атрымаліся вынікі: у сярэднім па ўсёй Беларусі «Залаты» ячмень даў ураджай вышэй, чым мясцовы амаль на 11 проц., а ў Полацкай акрузе—нават на 20 проц. У паасобных-жа выпадках розьніца была яшчэ вышэйшая.

Такім чынам, уводзячы ў культуру высокаўраджайны, высокакаштоўны, з пункту гледжаньня броварнае прамысловасьці, гатункі ячменю, БССР можа стаць дастаўшчыкам першакласнага броварнага ячменю для заграніччнага рынку.

Дасьледваньні Беларускай станцыі дазваляюць думаць, што якасьць броварных ячмянёў можна ўзьняць яшчэ вышэй. Гэта пацьвярджае той багаты матар'ял, які мы бачылі на палёх станцыі.

4. Канюшыне і лубіну —ганаровае месца

Значнае месца ў рабоце Беларускай дасьледчай станцыі займаюць пытаньні кармовае праблемы, ад шпаркага вырашэньня якое залежыць і разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў БССР. Станцыя зьвярнула сур'ёзную ўвагу на навукова-дасьледчую работу з кармавымі травамі: вікаю, гарохам, канюшынаю. Усе гэтыя культуры, а таксама і рад іншых, прадстаўлены на палёх станцыі. Асабліваю ўвагі заслугоўвае работа станцыі па вывучэньні канюшыны і вікі.

Сельская гаспадарка Беларусі паставіла перад станцыяй пытаньне, якія гатункі канюшыны павінна сеяць Беларусь—раньнія ці позьнія, г. зн. двухукосныя, ці аднаўкосныя? Наша сельская гаспадарка патрабуе тэрміновага адказу, якога станцыя так хутка даць не магла. Канюшына—расьліна шматгадовая і для вывучэньня яе патрэбна доўгая і крапатлівая работа.

Сёлета, аднак, Беларуская станцыя, на падставе даных трохгадовае работы, змагла ўсё-ж даць першую арыентовачную ацэнку канюшыне рознага геаграфічнага паходжэньня.

Выявілася, што заграніччная канюшына (эстонская, бэльгійская, французская і інш.) уладаюць вельмі кепскай зімастойкасьцю. Ва ўмовах Беларусі яны даюць грубую зялёную масу. Між тым, некаторыя гатункі расійскае канюшыны добра перанесьлі мінулую суровую зіму з нулявым процантам вымярзаньня.

Такім чынам, самае цяжкое пытаньне: якую канюшыну павінна выбраць Беларусь—знаходзіцца на шляху да вырашэньня станцыяй.



Дырэктар беларускай станцыі прыкладной батанікі т. Сюбараў.

Пераходзім да наступнага вучастку дасьледчага поля станцыі, на якім яна прабуе вырашыць адну з праблем узьняцьця ўраджайнасьці ў БССР—праблему зялёнага ўгнаеньня.

Адсутнасьць належнае колькасьці гною ў беларускай сялянскай гаспадарцы і тэхнічная немагчымасьць задаволіць зараз запатрабаваньні на мінэральнае ўгнаеньне высоўваюць зялёнае ўгнаеньне, заворваньне лубіну на першы плян. Ні адна з сельска - гаспадарчых расьлін так пераможна ня ішла па сялянскіх палёх Беларусі, як лубін. У 1924 г. пад лубінам была занята плошча ў 30.385 гэкт., а ў 1926 годзе яна павялічылася ўжо ў два разы.

Нашы аграномы гавораць, што зялёнае ўгнаеньне гэта багацьце беларускага селяніна, што ў зялёным угнаеньні—яго дабрабыт, што пры дапамозе зялёнага ўгнаеньня ён навысіць свой ураджай.

Варта ўспомніць, як мы кожны год увясну крычым аб недахваце насеньня лубіну. **Тлумачыцца гэта тым, што неакліматызаванае насеньне, што ўвозіцца ў Беларусь, у нас не высьпявае.** Адсюль і задача беларускай станцыі: **стварыць новы гатунак лубіну, які-б у Беларусі даў ня толькі высокі ўраджай зялёнай масы, але і зусім сьпелае насеньне.**

Каштоўная для сельскае гаспадаркі культура лубіну наогул яшчэ мала вывучана. Работа над яе вывучэньнем у **сусьветным маштабе** і вядзецца зараз беларускай станцыяй пад кіраўніцтвам прафэсара П. М. Жукоўскага. На нашай станцыі сканцэнтравана **сусьветная калекцыя лубіну,** якая высьпяваецца ўжо трэці год.

Вывучэньне лубіну ў сусьветным маштабе вядзецца Усесаюзным Інстытутам Прыкладной Батанікі на Беларускай станцыі, бо натуральна-кліматычныя ўмовы Беларусі найбольш спрыяючыя ў СССР і што ў правільным вырашэньні праблемы зялёнага ўгнаеньня больш за ўсё зацікаўлена БССР.

На палёх Беларускай станцыі мы бачылі прадстаўнікоў старажытнейшых месц, у якіх рос лубін: Амэрыкі, Эгіпту, Палестыны і інш. Побач-жа растуць прадстаўнікі тых раёнаў, дзе лубін пачаў разьвівацца ў апошнія гады.

Такі багаты падбор калекцыі дазваляе значна скараціць навукова-дасьледчую работу і хутчэй вырашыць пастаўленую беларускай сельскай гаспадаркай практычную задачу зялёнага ўгнаеньня.

На працягу 2-3 год Беларуская станцыя атрымлівала па 2-3 зярняткі самых рознастайных і рэдкіх гатункаў лубіну. Усё-ж зараз яго размножана ў такой колькасьці, што дало магчымасьць засеяць плошчу ў некалькі соцень квадратовых мэтраў.

Мы пераканаліся ў тым, што наша станцыя ўжо шмат чаго дабілася ў галіне вырашэньня пастаўленай задачы. Побач з лубінам «беларускім», які ледзьледзь тырчыць над зямлёй, расьце некалькі гатункаў іншага лубіну, багатага велясінаю і **ўжо квітнеючага** (сярэдзіна чэрвеня). Навуковыя работнікі станцыі зьвяртаюць нашу ўвагу на адзін з такіх кустоў лубіну, гаворачы, што вось гэты лубін патрабен Беларусі. У чым-жа перашкода? У тым, што станцыя хоча шляхам скрыжаваньня атрымаць лепш больш удасканаленых лубін. А пакуль што можна ўкараняць і гэты гатунак, які мае шмат пераваг перад «мясцовым».

5. Аб 600-грамавых цыбулінах і іншым

Да апошняга часу на гародніцтва і кармавыя кораньплоды ў Беларусі зьвярталасі вельмі мала ўвагі. Беларуская дасьледчая станцыя, разумеючы значэньне гэтай інтэнсыўнай галіны сельскае гаспадаркі і прадбачачы няўхільнасьць яе разьвіцьця на Беларусі, занялася дакладным вывучэньнем гэтых пытаньняў.

У зьвязку з узьнятай за апошні час кампаніяй аб максымальным разьвіцьці гароднічства і кораньплодаў карысна спыніцца на гэтым пытаньні некалькі больш падрабязна.

У Заходняй Эўропе спажываньне гародніны складае каля 10 проц. усёй стравы, у нас-жа—толькі 2,5 проц. Усім вядома, што акрамя сваёй спажыўнасьці, гародніна мае вітаміны, адсутнасьць якіх у аранізьме чалавека выклікае розныя захворваньні. Кітай і Японія—краіны з высокай шчыльнасьцю насельніцтва—выратоўваюцца ад голаду толькі дзякуючы сваім агародам. Адрэзаная ад усяго сьвету ў часе вайны Нямеччына, адчуваючы вялікі крызіс у збожжы, знайшла выхад у пашырэньні гародніцтва.

У той час, як на Захадзе няма сельскага гаспадара, які не гадаваў-бы кораньплодаў на корм жывёле, у Беларусі мы гэту справу ўсё яшчэ ніяк ня можам наладзіць. Усю зіму беларускі селянін трымае сваю жывёлу напоўгалодный, а ўвесну пачынае раскопваць саламяныя стрэхі, каб ня даць жывёле памерці галодный сьмерцю.

Гародніцтва дазваляе прадукцыйна скарыстаць кожны кавалачек зямлі. Гэта асабліва важна ў малазямельнай і перанаселенай Беларусі. Гэктар збожжавых культур дае ў нас ураджаю ў сярэднім 40-50 пудоў, а гэктар агароду—каля 2.000 пудоў. Прадукты гароднічтва, праўда, у некалькі раз менш спажыўныя, чым жыта. але ўсё-ж з аднэй і тэй-жа плошчы спажыўных матэрый з агароду атрымліваецца раз у пяць больш, чым з поля. Нарэшце, мы рад агародных культур можам вывозіць за мяжу. Возьмем, напрыклад, цыбулю. Экспартаваныя ў мінулым годзе ў Нямеччыну Наркамгандлем Беларусі каля 100 тысяч пудоў цыбулі знайшлі там добры збыт. Беларусь магла-б разгарнуць гэту справу шырэй; гэтаму перашкаджае нявывучанасьць культуры цыбулі, адсутнасьць чыстых гатункаў насеньня, неналаджанасьць забесьпячэньня пасадачным матар'ялам

Беларуская дасьледчая станцыя занята зараз як навуковай прапрацоўкай, так і вывучэньнем практычных мер па разьвіцьці агароднічства на Беларусі. Тое, што ёсьць ужо на дасьледчых палёх станцыі, сьведчыць, што яна ў значнай меры аўладала сусьветнымі рэсурсамі важнейшых агародных культур. З 4.000 узораў гэтай культуры выбірае лепшыя. Адных гатункаў бульбы станцыяй пасаджана больш 150. У даным выпадку яна мае на ўвазе выбраць так патрэбную нам раньнюю цыбулю і добрае якасьці кармавую і завадзкую бульбу. Станцыя ўжо дабілася пэўных посьпехаў у гэтай галіне. Ёсьць гатункі бульбы, якія далі падводны ўраджай параўнальна са звычайнай мясцовай бульбай.

Станцыя ў Лошыцы ўзмоцнена працуе над вырошчваньнем таварнае экспартнае цыбулі. У гэтай галіне дасягнуты таксама посьпехі. Між іншым, цыбулины на палёх станцыі дасягаюць вагі ў 600 грам. Зараз распрацоўваецца мэтодыка вырошчваньня гэтай капрызнай, але вельмі каштоўнай культуры.

У большай або меншай ступені, але пэўныя вынікі ёсьць па вырошчваньні і іншых агародных культур.

Наяўнасьць вялікага выточнага матар'ялу дала станцыі магчымасьць, побач з навукова-дасьледчай работай, прыступіць адначасова і да практычнай работы: **пачата сэлекцыя а гародных культур і гатункоае насеннаводзтва.**

Надзвычайна цікавая работа праведзена станцыяй у галіне вывучэньня гароху. Скрыжоўваючы вялікі матар'ял рознага геаграфічна паходжэньня, удалося выявіць звыш 10 фактараў, якія заставаліся да гэтага часу невядомымі навуцы і практыцы. Аказалася, што форма гароху міжземнаморскага і афрыканскага паходжэньня мае найбольшую колькасьць насьлядоўных фактараў, якія вызначаюць высокую прадукцыйнасьць расьліны ў той час, як формы паўднёва-заходняй Азіі, праўда, не такія ўраджайныя, але затое надзвычайна каштоўныя ў практычных адносінах—ім уласьцівая высокая «раздвоемость семянодолей». Магчымасьць стварэньня новага віду гароху, які мае ўсе ўласьцівасьці міжземнаморскіх і азіяцкіх форм, даведзена цэлым радам скрыжаваньняў.

Беларуская станцыя мае чым пахваліцца і ў галіне вывучэньня садовых культур, што мае вялікае практычнае значэньне у справе разьвіцьця садоўніцтва Беларусі. Станцыя імкнулася высьветліць залежнасьць ураджайнасьці садовых культур ад апладненьня. З гэтаю мэтаю яна на працягу двух год рабіла дасьледы па штучным апылкаваньні, непасрэдна ў садзе, і досьледы з вывучэньнем пыльца садовых культур у штучных асяродзінках.

Грунтуючыся на выніках сваіх трохгадовых дасьледчых работ у садзе і лябараторыі і скарыстаўшы дасягненьні іншых дасьледчыкаў, беларуская станцыя ў мінулым годзе залажыла на фольварку Заціпша пладовы рассадзік. Задачай гэтага рассадніку зьяўляецца пашырэньне на Беларусі лепшых па якасьці і больш рэнтабэльных пладовых гатункаў. Станцыя імкнецца пашырыць такія пладовыя культуры, якія былі-б, з аднаго боку, зімастойкімі, а з другога —давалі-б садавіну, якая магла-б быць скарыстана чалавекам у сырым відзе на працягу круглага году, г. зн. гутарка ідзе аб тым, каб яблыка, напрыклад, добра захоўвалася ад восені да восені.

6. А дзе-ж жыцьцё?

Такія асноўныя дасягненьні фактычна трохгадовай работы беларускай станцыі Усесаюзнага Інстытуту Прыкладной Батанікі і Новых культур. Пералічыць усяго, чаго дабілася наша станцыя, не прадстаўляецца фізычнай магчымасьці. Вось чаму я прымушаны быў абмежавацца кароткім і досыць агульным вылажэньнем толькі такіх ае работ, **якія ўжо ў даны момант маюць практычнае значэньне для сельскае гаспадаркі Беларусі.** Заслугоўвае ў дадатак да ўсяго сказанага быць адзначанай работа на драўнінных культурах. Станцыя шукае такія культуры дрэў, якія прыгодны былі-б і для тэхнічных патрэб Беларусі, а з другога боку такія культуры, якія зьявіліся б добрым матар'ялам для дрэвапасаджэньня ў гарадох і рабочых пасёлках. З гэтаю мэтаю ў Лошыцы сканцэнтравана 300 узораў салецэтуму—івы. Гэта культура зьяўляецца добрым матар'ялам для пляценьня кошыкаў, а таксама і для выпрацоўкі дубіцеляў. На тэрыторыі станцыі сабрана таксама 700 узораў іншых культур дрэў.

З самага-ж пачатку сваёй арганізацыі Беларускай станцыі ўдалося наладзіць сувязь з сялянамі-дасьледчыкамі—карэспандэнтамі. Зараз лік іх перавышае 400. Кожны год сялянам-дасьледчыкам рассылаецца пасёўна-пасадачны матар'ял з рассадніку станцыі. Гэтым самым станцыя атрымлівае матэрыял, які вызначаецца пэўныя свае культуры ў прыстасаваньні іх да паасобных натурально-гістарычных і геаграфічных раёнаў БССР. Цікава адзначыць, што на радзе культур на палёх сялян-дасьледчыкаў удалося дабіцца лепшых вынікаў, чым на гаспадарчых палёх станцыі, якія за час вайны моцна высілены.

Сказанага аб дасягненьнях Беларускай станцыі ў Лошыцы зусім даволі, каб зразумець тую вялікую ролю і значэньне ў справе інтэнсыфікацыі сельскае гаспадаркі БССР. Трэба з усёй адкрытасьцю прызнаць, **што амаль усе** важнейшага значэньня дасягненьні станцыі не знаходзяць пакуль што практычнага прыстасаваньня ў жыцьці. І гэта ў той час, калі на палёх Лошыцкай станцыі сапраўды заложана раскрыцьцё сакрэту павышэньня ўраджайнасьці беларускіх палёў, аб чым мы так многа крычым.

Нельга гаварыць сур'ёзна аб шпаркім павышэньні ўраджайнасьці ў Беларусі бяз шырокага прыстасаваньня практыкі станцыі ў нашай сельскай гаспадарцы.

Вельмі дрэнна, што ў нас, як быццамбы, склалася думка аб гэтай станцыі, як аб установе, якая займаецца толькі «вузка-навуковай» дзейнасьцю, якая ня можа прынесьці нам практычнай карысьці ў бліжэйшы час. І яшчэ горш і больш недапушчальна, калі такія-ж адносіны ёсьць і з боку Наркамзему, і Наркамфіну БССР.

Гэтую грубую памылку, якая можа каштаваць нашай народнай гаспадарцы сотні мільёнаў рублёў, трэба рашуча і хутка выправіць. Нашы кіруючыя органы павінны ўсьвядоміць сабе, што беларуская станцыя ў Лошыцы зьяўляецца адным з выдатных і буйных дасягненьняў Кастрычніка на Беларусі, але што гэтае дасягненьне зьяўляецца замкнутым **у самым сабе, ня прыносячы** тэй вялічэзнай практычнай карысьці, якую яно можа даць.

Такое становішча далей цягнуцца ня можа. Да работ Беларускай дасьледчай станцыі Усесаюзнага Інстытуту Прыкладной Батанікі павінна быць прыказ на ўвага ўсёй савецкай грамадзкасьці, працоўных мас Беларусі. Гэта станцыя павінна заняць пачэснае месца ў нашай сельскай гаспадарцы.

Як нам ня сорамна, а трэба сказаць, што станцыя знаходзіцца ў нас на палажэньні пасынка. Прыходзіцца зьдзіўляцца, што ўсе яе работы выканаць **толькі 5-ю асноўнымі навуковымі работнікамі.** Зусім відавочна, што станцыя ня можа працаваць так, як гэта трэба было, з такім абмежаваным лікам навуковых

Беларускі пралетарыят і працоўнае сялянства сёньня схіляюць свае галовы перад прахам рабочых і сялян Савецкага Саюзу, перад прахам беларускіх партызан, якія аддалі свае жыцьцё за вызваленьне Беларусі, за сьветлую будучыню БССР

УСПАМІНЫ ПАРТЫЗАНА-КАМУНІСТАГА

(Напярэдадні ліпеня)

... Канец чэрвеня 1920 году. Да гэтага часу партызанскі рух, натхнёны камуністычнай партыяй, яе падпольнымі арганізацыямі і работнікамі, стыхійна захапіў шырокія колы сялянскай беднаты, у гэты час партызанскія атрады рыхтаваліся нанесьці беларускім акупантам моцны ўдар з тылу. Патрэбна было распрацаваць агульны плян актыўнага выступленьня, трэба было абмеркаваць задачы кожнага атраду... З гэтай мэтай мы, камуністыя-падпольшчыкі, прызначылі нараду кіраўнікоў усіх партызанскіх атрадаў, якія былі на тэрыторыі нашага вучастку. На нарадзе мелася прысутнічаць 35-40 чалавек кіраўнікоў і прадстаўнікоў 4-х Рудабельскіх, Азарыцкага, Чэрвеньскага. Гарбацэвіцкага, Асавецкага, Броскага, Старадарожскага, Лясківіцкага і інш. атрадаў. Такія нарады намі праводзіліся раней, а даная была асабліва неабходна.

У лесе паміж Глускам і Гарадком каля вёсак Вільча і Балашэвічы выбрана палянка. Па ўсіх меркаваньнях мясцовасьць падыходзіла: папершае, лес ня прыцягваў да сябе падазронасьці з боку беларускай, падругое знаходзіўся ад франтавой лініі ў вярстах 80-100...

Нарада прызначана... Намі ўмоўлена, якія знакі зрабіць у лесе ў выпадку пагрозы небясьпекі, чым і як зрабіць умоўны знак пры тэй умове, калі ніякай небясьпекі няма.

На 3 ліпеня ўдень прызначаны збор. Да гэтага часу мы чакалі кіраўніка Гарадоцкага атраду т. Ешчыка, які быў пасланы праз фронт **да ўпоўнаважанага ПУЗАПА**, каб разьведаць становішча, узгодніць наша выступленьне, даведацца, дзе, як і ў якім месцы патрэбен націск на беларускай з тылу...

Цэлы дзень 2 ліпеня прайшоў у чаканьні нашых лазутчыкаў. Яны павінны былі мне, як кіраўніку атрадаў, паведаміць аб становішчы. Але яны чамусьці ня прышлі. Гэта прымушала хвалявацца. Уначы з 2-га на 3 ліпеня я накіраваўся ў лес на палянку, на якой мае адбыцца нарада. Прышоў у лес... і не знашоў абсалютна ніякіх знакаў, якія мы ўмовіліся рабіць на выпадак небясьпекі ці наадварот.

Гэта зрабіла загадковым усё становішча. Невядома, ці нам пагражае небясьпека, ці можна зьбірацца на нараду.

Іду разьведаць. Абыйшоў кругом умоўленую палянку і накіраваўся да сядзібы лясьніка. А там... там атрад беларускай. Мяне ахапіў жах за кіраўніком атрадаў, за ўвесь партызанскі рух.

— Будуць ісьці групамі на нараду, пераловяць усіх... Самых лепшых, кіраўніцтва ядра рух будзе пазбаўлены... —праносіцца ў мяне ў галаве і ня хочацца верыць, што гэта будзе так, як зараз праскоквае ў думках. Я ўмоўнымі знакамі ў лесе сыгналізаваў трывогу. Умоўныя знакі гаварылі—небясьпека, я іх пакінуў і пашоў перадаваць, каб зьбіраліся ў другое месца.

Толькі рупныў а месца, як частыя стрэлы ўзарвалі цішыню: каля Гарадка пачалася перастрэлка. Недалёка ад Гарадзішча, каля мосту разьмясьціўся беларускі атрад, каб злавіць партызанскіх кіраўнікоў, што меліся ісьці на нараду. У маёнтку, побач з в. Запольлем 50 легіянэраў паважыліся захапіць запольскіх партызан. Становішча ускладнялася.

З лесу выйсьці нельга. Я прысеў. Чалавечая стомленасьць перамагла партызанскую настарожанасьць... прыдрамнуў. Прахапіўся і вакол сябе заўважыў акуркі, якіх ня было раней, пазнаў сьляды польскіх жаўнераў. Яны напэўна прынялі мяне за ўраўра і зрабілі вакол мяне кола чалавечым ланцугом... Чакалі, што падыйдуць больш партызаны. Ідуць дзьве сялянкі. І легіянэры, што абступілі мяне шырокім колам, зрабілі яшчэ большае кола, што дало магчымасьць мне падыйсьці да кабет. Іду з імі і гутару на адцягненыя гаспадарскія тэмы... У торбачцы бомбы закручаны так, як на сенакос носяць хлеб, а за пазухай маўзэр...

Я выйшаў на адкрытае месца, каб ня быць схопленым зьнянацку жывым. Ужо разьвіднялася. Ад лясьніка беларускі выйшлі ў лес. Накіроўваемся да лясьнікоўай сядзібы, спатыкаем шпіёна з мясцовай шляхты. На гэты раз ён быў добра выкарыстаны ў якасьці праваднікa пад пагрозай маўзэра.

— Будуць хапаць палякі—паплоцішся, вывядзеш, будзеш вольны—такія былі пастаўлены ўмовы шпіёну, які зараз вёў мяне пад рулём маўзэра... І вывеў добра.

Выйшаўшы з лесу сустракаю 6 партызан. Загад кароткі.

— Небясьпека... папераджайце прадстаўнікоў атрадаў...

Пасьля іх сустракаюся з т. **Ламака**—адным з актыўных нашых партызан. Ён нёс шыфр, ішоў з фронту і тут-жа быў забіты.

Здалёку я падаў яму ўмоўны знак аб небясьпецы, кінуўся ён уцякаць, і быў дагнаны коннымі легіёнамі...

Іду да в. Балашэвічы, каб папярэдзіць прадстаўнікоў ад Рудабельскіх партызанскіх груп, і там даведваюся, што арыштаваны адказны наш лазутчык «Васіль»... Стала ясным, чаму ў нас прыпынілася справа па разьведваньні становішча. Усюды на раздарожжах польскія заставы, па дарогах блукаюць шпіёны.

— Хто здраднік?

Вось пытаньне, якое нечым вялікім і страшным варочалася ў сьвядомасьці, у думках.

— Знайсьці яго.

І прасьлізнула падазронасьць на партызана Дубінчыка. Іду да яго ў хату. Жонка плача...

— Дзе Дубінчык,—пытаюся ў яе.

— Прыяжджалі палякі,—расказвае мне, усхліпваючы, яна—арыштавалі і невядома, ці жыў ён цяпер.

— Не, ня ён здраднік,—цьвёрдая ўпэўненасьць апанавала мяне.

Становішча крытычнае... Нарада сарвана... Сгварыць плян агульнага выступленьня не ўдалося...

— Захоўвайце атрады... Арыентуйцеся ў сваіх умовах і вядзеце работу...—кацілася праз умоўныя знакі, праз шыфр з атраду ў атрад... А тут націскаюць нашы чырвонаармейскія часьці. Час не чакае... Патрэбна актыўнае выступленьне ва ўсіх пунктах.

І атрады з падвойнай энэргіяй узяліся за работу.

Рудабельскія партызанскія атрады адкрылі актыўныя выступленьні супроць беларускіх у дарогах: Азарычы-Рудабелка, Рудабелка-Парычы, Рудабелка-Ратміравічы і ў іншых пунктах.

Гарбацэвіцкі атрад псуе тэлеграфную і тэлефонную сувязь, адрэзаўшы Бабруйск ад Менску, Слуцку і Глуску. Потым зрывае масты і выступае ў бойкі з часьцямі беларускіх.

Старадарожскі атрад самаахвярна адстойвае мост праз рэчку Пціч на шашы, якая ідзе з Бабруйску на Слуцак. Гэты мост для чырвонаармейскіх часьцей меў вялікае значэньне, калі яны прасьледвалі беларускіх. Пад прыкрыцьцём агню з бронямашыны легіянэры некалькі раз падпальвалі мост. Партызаны іх здзівалі... Бронямашына адступіла з пасканаванымі шынамі... Легіянэры адбіты агнём партызан, мост застаўся цэлым.

Гарадкоўскія, Глускія і інш. партызанскія атрады ў розных пунктах даганялі рашучыя баі беларускім.

Уся гэта работа партызанскіх атрадаў, падрываньне сувязі, напады на часьць беларускіх, агітацыя сярод насельніцтва і сярод некаторых частак легіянэраў—наганялі жах на акупантаў... Яны былі зьбянтэжаны, запалоханы. І досыць было зрабіць наскок, як гэта адчувалася на фронце...

Партызаны зрабілі вялікую рэвалюцыйную справу...

Падамо толькі некалькі фактаў канкрэтных выпікаў з іх работы. Агітацыя сярод легіянэраў пладзіла масавае дэзэртырства. У Гарадкоўскай воласьці група ўзброеных дэзэртыраў з фронту наткнулася на жандармэрскія заставы. Дэзэртыры далі заставе бой і пашлі ў тыл, засталіся ў лесе партызаніць.

Атрад беларускіх, які стаяў у маёнтку Вільня, быў разложаны агітацыяй Гарадоцкіх партызанаў, і як толькі быў пасланы на фронт, дык перайшоў добраахвотна да Чырвонай арміі. Рудабельскія партызаны ў баёх з беларускімі часьцямі, ня гледзячы на няроўнасьць сіл, адбілі 150 фурманак абозу, захапілі шмат зброі.

* * *

Асобна закранем работу Крынкаўскіх партызан. Гэтыя партызаны ў свой час (у маі 1920 г.) напалі на ст. Дараганава, разбурылі пункт сувязі, перабілі ахову, спалілі будынкі, нагнаўшы страх на беларускіх часьці.

Але частка крынкаўскіх партызан была пералоўлена. І таварышы—Ярашэвіч Якуб, Пінчук Сава, Кузьмін Цімох, Сашчэка Захар, Пінчук Янка, Кузьміч Янка расстраляны і пахаваны ў Асіпавічах.

* * *

Вось адзін з эпізодаў тэй вялікай і слаўнай барацьбы, якую пачалі і пераможна скончылі у 1920 г. беларускія рабочыя і сяляне.

Гэтая перамога была магчыма толькі таму, што на чале барацьбы працоўных Беларусі ўвесь час стаяла і стаіць Ленінская камуністычная партыя,—вярнейшы правадыр і кіраўнік.

М. ЛЯЎКОЎ.

ЛЯ МАГІЛ СІБІРСКІХ СТРАЛКОУ

... Кацілася танкавым скрогатам хваля белапольскай навалы, руйнавала пажарам, агнём дынаміту здабычу працы людзкой, катавала мячом і розгай пад рытм «двадзесьце пеньць» усё жывое, безабароннае, сустрэчнае на сваім шляху...

Пылала вогнішча..

Цурчэла кроў...

Усхліпвалі сіроты дзеці...

І ўдарылася хваля імпэрыялістычнай навалы бразгучым шквалам аб цьвярдыню берагоў Бярэзіны і Дняпра—ударылася яна ў сустрэчную цьвярдыню рабоча-сялянскіх палкоў Чырвонай арміі, рассыпалася пырскамі крыві і брудна-пенным адлівам хлынула назад, «до ойчызны», да Варшавы...

Гэта пара—крывавага сьледу белапольскай акупацыі Беларусі—яна вызначана ў гісторыі датамі:

„8-VIII-1919—11-VII-1920"

Гэтай пары ня можна забыць!

Калі выветрыліся па абшарх Беларусі за 9 год крывавыя сьляды рабаўнічага панскага боту, калі скапычаныя польскімі ўланамі нівы падняты трактарамі і рыхтуюць ужо нам дзеяты ўраджай, калі крывавыя пуцявіны партызан, руіны і пажарышчы гарадоў, мястэчак і вёсак забудоўваюцца палацамі навукі і асінстроямі—нам здаецца як-бы і нічога ня было!

У грандыёзным размаху сацыялістычнага будаўніцтва, у нашай сучаснай сьветлай будзённішыне здаецца: крывавая мінуўшчына забыта!

Але вось надыходзяць ліпнёвыя дні...

Прыглядзьцеся, да якой гэта, нябывалай у гісторыі старога сьвету, ўрачыстасьці рыхтуюцца рабочыя, сяляне і Чырвоная армія...

Прыслухайцеся, аб чым апавядаюць народныя казкі, апавяданьні, песьні, прыказкі, гімны...

Пагаманеце з маладым пакаленьнем-піянэрамі...

Пайдзеце ў гэтыя дні на вёску, далучэцеся да радоў грамады, што накіроўваецца, сьпяваючы рэвалюцыйныя гімны з чырвонымі штандарамі і вянкамі ў прастор палёў, бярэзьнікаў, і вы патраніце з гэтай памятлівай грамадой на могілкі загінуўшых гэрояў, паклаўшых сваё жыцьцё за Савецкую Беларусь!

Хто яны?

Адкуль яны?

Надпіс хэмічным алоўкам на дошчачцы вам раскажа, хоць нянісьменна ня зусім дакладна, але калі вы ўдзельнік гэтае барацьбы, калі вы сэрцам жывяцё з ёй, вы пазнаеце, вы зразумеяце...

* * *

І сёньня 11-га ліпеня, у 9-ю гадавіну вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, я ўпэўнен—абновіцца зялёным муравам ды жывымі кветкамі і чырвань-стужкамі магіла Дукорскіх партызанаў...

Веру, што і сёньня, як і кожны год зацьвітуць асірацелыя, па аднэй раскіданыя на палёх, знаёмых мне вёсак Сёмкава-Гарадзецкага сельсавету, магілкі чырвоных загінуўшых у барацьбе за чырвоны Менск, таварышоў з Самары, Уфы, Казані, Чалябінску і далёкай Сібіры.

Іх успомняць, іх наведаюць масы працоўных сялян з рабочымі-шэфамі, яны ўпрыгожаць магілкі дзесяткамі вянкоў і істужак, тут адновяцца ў памяці прыгожыя ўспаміны аб іх самаахвярным змаганьні з польскай белагвардзейшчынай і мясцовай контрэвалюцыяй, за дыктатуру пралетарыяту, за Савецкую Беларусь!

Колькі пачуцьця і энэргіі адраджаецца ў гэтыя дні ўспамінаў! І якім мізэрным адчуваецца вораг, ці ён унутраны контр-рэвалюцыянэр, выступаючы супроць сібірскіх партызанаў і савецкага ладу, ці ён замежны імпэрыялісты, фашысты-пілсудчык—перад гэтай магутнай усхваляванай сілай працоўных!

Які запал нянавісьці выбухае ў нашы дні да клясавага ворага, колькі імпэту да барацьбы за ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту і за вызваленьне яшчэ падняволенай Заходняй Беларусі!..

* * *

Дзевяць год з лягка прайшлі як дзевяць крокаў.

Беларусь лапцюжна-лучынная пераапранаецца ў Беларусь індустрыяльна-электравокую.

Беларусь Савецкая, як роўная паміж роўных, поплеч з братнімі савецкімі рэспублікамі пачала свой **залаты век** ад вялікага **Кастрычніка** і будуе сацыялістычную бацькаўшчыну як вузор для працоўных усяго сьвету.

Магілы Сібірскіх стралкоў, магілы чырвонаармейцаў: расійцаў, татар, вацякоў, чувашоў, кітайцаў, яўрэяў, палякаў, узбэкаў, украінцаў і беларусаў,—магілы, якімі усеяны ня тольківаколіцы нашай сталіцы Менску, а і ўвесь абшар Беларусі, гэтыя магілы зьяўляюцца першай данінай працоўных Савецкага Саюзу ўсясьветнаму капіталу за заспаваньне на Беларусі **КП(б)**, за заспаваньне **БССР**—дыктатуры пралетарыяту, гэтыя магілы паўшых барацьбітоў на векі застануцца ў памяці пакаленьняў, будуць служыць ім лепшай крыніцай для натхненьня ў барацьбе за Ўсясьветны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

Я. ЧАЛЯДЗІНСКІ.

Бярэзіна--Менск

Быў дзень 6-га ліпеня. Камандны склад выбіраецца на рэкагнасцыроўку тых пунктаў, дзе яму са сваімі часьцямі трэба будзе аўладаць рэчкай Бярэзінай. Частка камандзіраў і палітікіраўнікаў, што засталася, праводзіць гутаркі з чырвонаармейцамі. Толькі пачаўся змрок, як пачалі, не парушаючы цішыні, пасоўвацца чырвонаармейскія часьці да сваіх выхадных пунктаў. Ідуць чырвонаармейцы і лаюць сваіх сувязістых за тое, што яны тэлефоннымі праводамі ўблыталі мясцовасьць аж да Бярэзіны.

Па дарозе чырвонаармейцы цікавяцца: «Колькі вёрст да Варшавы, ці хутка да яе можна дайсьці?»

Пантанёры рыхтуюць плыты для пераправы праз Бярэзіну. Кругом цішыня. Толькі часамі разносіцца неасьцярожны стук сякеры і сяды-тады пачуеш стрэл вартавога, якому надакучыла цішыня і цёмная ноч.

Разьведка паведамляе, што перад нашым палком было каля двух батальёнаў белапалякаў. Па нашых меркаваньнях сілы былі роўныя, але наша перавага была ў тым, што ў нас была добрая сіла артылерыі.

Праз хвілін дваццаць наша разьведка прывяла некалькі белапалякаў, захопленых у палон. Яны знаходзіліся ў дазоры. Дрыжачым голасам палонныя апавядаюць пра сілы нашага ворага, пра тое, дзе знаходзяцца кулямёты, пра настрой у белапольскіх часьцях.

Хутка рыхтуем батальён... Хутчэй рухацца... Перапраўляем другі батальён, а трэці згрупавалі каля ракі, каб пры першай магчымасьці перакінуць на другі бераг.

Пракацілася гучнае «ура» і падняласа стрэльніна са стрэльбаў і кулямётаў. Сяды-тады разарвецца знарад белапольскай артылерыі. Мы штабам пераправляемся на заходні бераг Бярэзіны і там сустракаем нашых параненых чырвонаармейцаў. Яны з радасьцю нам паведамляюць: «Нашы занялі першую лінію акопаў, здорава патрапалі ворага».

Бой цягнуўся каля дзьвёх гадзін.

Мы заўладалі дзьвюма лініямі акопаў, захапіўшы трафэі і шмат палонных. Вёска Глівен яшчэ заставалася ў руках белапалякаў. І мы вырашылі адным батальёнам ударыць з тылу, а двум астатнім было дана заданьне прасьледваць яго ў напрамку Праходы-Перасады.

Прайшоўшы каля 5-ці вёрст, вораг кінуў насустрач нам рэзэрвы, якія занялі выгодныя рубяжы. Ад лабавога ўдару мы вынікаў не чакалі. І таму камандзір брыгады загадаў праз балоты і лес, пры дапамозе праваднікоў сялян, выйсьці ў тыл белапалякаў, каля вёскі Печы. Прабіраемся па балоце праз лес і, нарэшце, праз гадзін тры-чатыры прыходзім да вызначанага пункту. Нашы разьведчыкі на аснове паведамленьняў сялян расказалі, што ў вёсцы Печы артылерыя белапалякаў, чатыры гарматы. Мы вырашылі без адзінага стрэлу атакаваць. Вораг ніколі не чакаў такой неспадзяванай атакі і нават нашага неспадзяванага прыходу сюды. Жаўнеры разьбегліся, артылерыя і палонныя захвачаны.

Надыйшла ноч, чакаем ворага з ўсіх бакоў і таму разьмясьціліся кольцам, выслаўшы разьведку ў тым напрамку, з якога 8 ліпеня на сьвітаньні вырашана было ўдарыць ворага ў тыл. Разьведка паведамляе: па шляху з захаду на нас насоўваецца каля батальёна белапалякаў. Пачало днець. Мы уклініваемся паміж батальёнам, які пасоўваецца з захаду, і між тымі часьцямі ворага, што затрымліваюць нашы часьці з фронту, завязаўся вялікі бой, вораг імкнецца нас асіліць, але дарэмна. Пасьля яго некалькіх атак мы пераходзім у контратаку. Асабліва дружна кінулася ў бой рота Кацярынбурскіх камунараў.

Вораг пачаў уцякаць. Вядзем наступленьне на ст. Жлобін. У вярстах дзьвёх белапалякі зноў спыніліся і сіляцца затрымацца. Бой цягнуўся з пераменным посьпехам каля 12-ці гадзін, і толькі пачало віднець 9-га ліпеня нашы роты па іржышчы падпаўзьлі і атакавалі белапалякаў, зламаўшы лінію, якую яны займалі. Мы пачалі далей наступаць на Чорны Бор. Вышаўшы на лінію Смалявічы, вораг зноў падрыхтаваў сабе пазыцыі. Белапалякі сустракаюць нас агнём, мы доўга ня думаючы, сваю артылерыю выкацілі на адкрытую пазыцыю, распачалі агонь і зараз-жа перайшлі ў атаку. Ворага выбілі.

Раніцой адзінаццатага ліпеня наш полк выходзіць паўночней на лінію Менск, а каля 12-ці гадзін мы вышлі на чыгунку Менск-Вільня ў васьмі вярстах ад Менску. Адзін батальён прайшоў праз чыгунку і, калі пачала праходзіць пярэдняя частка галоўных сіл, мы ўбачылі, што з Менску пасоўваецца на захад нейкі цягнік. Сапёры разьдзел пачаў разьбіраць чыгунку. Пяхоту разьмяркоўваем в кулямётамі па абодвух бакох чыгункі, каб атакаваць цягнік. Выявілася, што гэта бронецягнік ворага ўцякае з Менску. Вось ён параўняўся з нашай пяхотай і падыходзіў да разабранага шляху. Наша пяхота распачала агонь, потым кінулася ў атаку, белапалякі зьбянтэжыліся і адказалі нам частымі стрэламі, але ад іх мы ня мелі ахвяр. Палякі спыняюць цягнік і, ня вылазячы, крычаць «ваш пан».

Наш выхад на чыгунку Менск-Вільня ня даў магчымасьці белапалякам адыходзіць на паўночны захад.

Гэта адзін невялічкі эпізод барацьбы за вызваленьне Беларусі ад белапалякоў.

ЯНКА ВАСІЛЕВІЧ.

ЧЫРВОНАЙ АРМІІ—шчырае прывітаньне ад рабочых і сялян Савецкай Беларусі!

5 год Беларускай нацыянальнай дывізіі

Сёньня, у 9-ю гадавіну вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, Беларуская дывізія сьвяткуе 5 год свайго існаваньня, як нацыянальнай часьці Чырвонае арміі.

З якога балянсам прыходзіць Беларуская дывізія да юбілею? Перш-наперш трэба адзначыць, што беларусізацыя дывізіі ў асноўным выканана. Камандным складам—беларусамі, дывізія ўкамплектавана амаль што на 70 проц., іншыя таксама ўладаюць беларускай мовай.

Уся палітыхаваўчая работа праводзіцца на беларускай мове (палітзаняткі, па-зашкольная работа, работа ленкуткоў).

Пры актыўным удзеле вайскораў дывізіі выходзяць 2 беларускія вайсковыя газэты: «Чырвонаармейская Праўда» і «На варце».

На беларускай мове выкладаецца таксама большая частка вайсковых дысцыплін. Некалькі адстаюць у гэтым кірунку толькі спэцыяльныя часьці: артылерыя, сапёры, сувязь, дзе не хапае належных падручнікаў для выкладаньня прадметаў на беларускай мове.

Навучаньне на родной мове спрыяла паляпшэньню якасьці вучобы. Праведзеныя тактычныя заняткі, стрэльбы, праверка палітычных ведаў паказвае, што падрыхтоўка байцоў Беларускай дывізіі стаіць на належнай вышыні.

Некаторыя часьці дывізіі зьяўляюцца тэрыторыяльнымі. За гэтыя гады праз вайсковы палітычную вучобу ў дывізіі, праз тэрытарыяльныя зборы прайшлі тысячы рабочых і сялян. Валікая работа праведзена дывізіяй у справе вялізацыі працоўных, прасоўваньня вайсковых ведаў на прадпрыемствы і ў вёску. Аказана значная дапамога арганізацыям Асоавіяхіму.

У раёне камплектаваньня дывізіі працуе да 70 вайсковых куткоў і вайсковых гурткоў, да 1.300 пераменьнікаў выпісваюць вайсковыя газэты.

Чырвонаармейцы Беларускай дывізіі зьяўляюцца ня толькі добрымі байцамі, але і будаўнікамі сацыялізму. У гэтым годзе ў калгасы запісалася 206 чалавек. За апошнія 5 год з бестэрмінова-адпускных падрыхтаваны тысячы нізавых працаўнікоў савецкіх і каапэрацыйных арганізацый. Да дзьвёх тысяч байцоў ліквідаваны сваю нянісьменнасьць.

Значна ўзрос палітычны і культурны ўзровень рабочых і сялян, якія прайшлі школу Чырвонае арміі.

Беларуская дывізія мае багатыя баявыя традыцыі. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі байцы дывізіі пасьпяхова змагаліся на франтох грамадзянскае вайны. Зараз яны таксама пасьпяхова змагаюцца на фронце ўздыму баявой здольнасьці дывізіі, павышэньня палітычна-культурнага ўзроўню.

ГЛЕБАЎ.

А 12 ГАДЗІНЕ 11 ЛІПЕНЯ

ЯК 27 ДЫВІЗІЯ ЗАНЯЛА МЕНСК

Часьці 27-й дывізіі адыгралі амаль першую ролю ў вызваленьні Беларусі ад белапалякаў, у прыватнасьці, у баёх за Менск.

27 дывізія была перакінута на Заходні фронт з далёкай Сібіры, з раёну Мінусінску. Яна мела ў сваіх радох каля 3.500 камуністых, камандны склад быў з рабочых і бяднейшых сялян.

6 ліпеня ў раёне ст. Крупкі і Слаўнае згрупаваліся 80 і 81 брыгады. Дывізія атрымала баявое заданьне — фарсаваць р. Бярэзіну і перайсьці ў рашучае наступленьне, каб заўладаць Смалявіцкім раёнам.

Перадавыя часьці, ня гледзячы на шалёны кулямётны і гарматны агонь, праскочылі праз р. Бярэзіну і пачалі напіраць на палякаў. 81 брыгада ўдарыла ў крыло праціўніка, і палякі пачалі адступаць па ўсім фронце.

Ноччу на 11 ліпеня часьці 27 дывізіі перайшлі ў рашучае наступленьне. На ўсім фронце 241 полк, зьніччыўшы батальён праціўніка, прарваў умацаваную лінію палякоў і палкі брыгады рупыліся на Менск. Кавалерыйскі полк, які ішоў за пяхотаю, праскочыў праз прарыў. Палякі былі выбіты, панесьлі значныя страты людзьмі і матар'яламі і адступілі да гораду.

А 12 гадзіне 11 ліпеня часьці 27 дывізіі, разьбіўшы праціўніка каля ст. Менск, увайшлі ў сталіцу Савецкай Беларусі.

Наступіў канец белапольскай акупацыі.

В.

Паведамленьні

— Дом асьветы. У суботу, 13 ліпеня,— г. г. роўна а 6½ гадз. увечары адбудзецца агульны сход жанчын—сяброў саюзу працасьветы і ўтрыманак сяброў саюзу в наступным парадкам дня: 1. Справаздача дэлегатак і 2. Даклад аб чыстцы партыі.

— Рэспубл. бюро АРУ. У пятніцу, 12 ліпеня—роўна а 6 гадз. увечары ў памяшканьні РСІ (2 наверх, пам. № 3) адбудзецца чарговае пасяджэньне прэзыдыуму Распубл. АРУ

Парадак дня:

1. Зацьвярджэньне пляну працы на 2 паўгодзьдзе 1929 г.

2. Зацьвярджэньне каштарысу на 2 паўгодзьдзе 1929 г.

3. Аб удзеле АРУ ў сацыялістычным спаборніцтве.

4. Аб скліканьні агульна-гарадзкога сходу сяброў АРУ.

Запрашаецца актыў АРУ.

— Сад харчавікаў. Сёньня, 11 ліпеня—вечар, прысьвечаны 9-годзьдзю вызваленьня Беларусі ад белапалякаў: 1) даклад, 2) канцэрт в удзелам яўрэйскага дзярж. хору. Пачатак у 8 гадз.

У садзе іграе духавы аркестр.

Уваход па разданых білетах.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Кансэрватары ўнесьлі рэзалюцыю недавер'я ўраду

Сноўдэн аб разьвіцьці унутрыімпэрскага гандлю

ЛЁНДАН, 9. Кансэрватары ўнесьлі рэзалюцыю, якая выказвае ўраду недавер'е за тое, штэ ён ня можа дакладна вызначыць сваю палітыку ў пытаньні аб ахоўваючых і іншых падобных мыт, а таксама ў пытаньні аб прынцыпах «імпэрскае пераваги» (Ахоўваючымі завуцца ў Англіі натуральныя мыты, якія ўводзяцца па хадайніцтву прадстаўніцтва тэй або іншай галіны прамысловасьці на падставе закону аб ахове ангельскай прамысловасьці; прынцып «імпэрскае пераваги» выяўляецца ў тым, што тавары, галоўным чынам харчовыя прадукты і сырэц, што ўвозяцца з аднэй часткі брытанскай імпэрыі ў другую, абкладаюцца паніжанымі мытамі або вызваляюцца ад мыт).

У спрэчках з поваду гэтай рэзалюцыі міністар фінансаў Сноўдэн сказаў: «Прынцып імпэрскае пераваги быў памылковым і нездарэвым. Нельга ўжываць яго, не абкладаючы мытамі харчовыя прадукты і сырэц, што ўвозяцца з-за мяжы. Урад зусім не зьяўляецца прыхільнікам такога парадку. Рабочая партыя напэўна заяўляла, што мыты Мэк-Кэна будуць скасаваны і ніхто не павінен зьдзіўляцца, калі ў бліжэйшым бюджэце гэтыя мыты ня будуць прадугледжаны. Таксама, калі міністар гандлю ўнясе ўвосень законапраект аб скасаваньні ахоўваючых мыт, дык ён зробіць гэта з поўным правам. Я спадзяюся, што ўрад рабочай партыі да таго, як ён пакіне ўладу, скасуе мыты на цукар, сушаныя фрукты і наогул на ўсе харчовыя прадукты; разам з гэтымі мытамі зьнікне натуральна, і так званая «імпэрская перавага».

Урад згаворваецца зараз з іншымі часткамі брытанскай імпэрыі, каб высьвятліць, ці магчыма скліканьне імпэрскай эканамічнай канфэрэнцыі для абмеркаваньня пытаньня аб тым, што можна зрабіць для разьвіцьця ўнутрыімпэрскага гандлю».

Пры галасаваньні рэзалюцыі кансэрватараў, яна была адхілена 340 галасамі рабочай партыі і лібэралаў супроць 220 галасоў кансэрватараў.

Англія патрабуе ад Францыі выплату доўгу

ЛЁНДАН, 9. Сноўдэн, адказваючы ў палаце вобшчын па запытаньні, даныя яму з поваду пляну Юнга, заявіў:

«Можна сказаць, што ў выніку ажыцьцяўленьня пляну Юнга, Францыя і Італія будуць карыстацца правам пераважнага задавальненьня з паступаючых ад Нямеччыны рэпарацыйных плацяжоў. Англія ні ў якой меры не абавязалася прыняць прапанову камісіі экспэртаў; гэтыя прапановы будуць абмяркоўвацца на міжнароднай канфэрэнцыі, якая мае адбыцца.

Ангельскі ўрад высоўвае асноўны прынцып, згодна якому Францыя, робячы які-небудзь плацёж у пакрыцьцё свайго доўгу ПАЗШ павінна таксама зрабіць адпаведны па разьмерах плацёж для пакрыцьця свайго доўгу Англіі. Урад сочыць з вялікай зацікаўленасьцю за спрэчкамі, што адбываюцца ва Францыі з поваду згоды аб даўгох і будзе пры адпаведных акалічнасьцях дамагацца ажыцьцяўленьня высунутага ім прынцыпу.

Сьвяткаваньне у Менску 9-й гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў

Сёньня, а 12 гадз. каля клюбу К. Маркса зьбіраюцца рабочыя дэлегацыі, якія накіруюцца ў лягеры для ўдзелу ў чырвонай прысязе маладых чырвонаармейцаў. А 6 гадз. увечары рабочыя дэлегацыі накіруюцца на вайсковыя магілкі для ўшанаваньня памяці загінуўшых барацьбітоў за аслабаненьне Беларусі. На магілках адбудзецца мітынг, на якім выступіць т. ІГНАТОЎСКІ, СЛАВІНСКІ, ГУРВІЧ і інш.

* * *

У садзе працасьветы сёньня адбудзецца вечар будаўнікоў, прысьвечаны 9-ці годзьдзю аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў. Такія-ж— вечары адбудуцца і ў іншых саюзах.

* * *

11 ліпеня у „Чырвонае Урочышча" выяжджае ўвесь склад цырку і балету, якія будуць абслугоўваць рабочых і чырвонаармейцаў.

У артылерыйскія лягеры выяжджаюць артысты тэатру „Пралеткульт".

ТЭАТР і КІНО

Гастролі Маскоўскага 1-га рабочага Тэатру Пролеткульт

Тэатр „ПРАФІНТЭРН"

Чацьвер, 11 ліпеня — для саюзу дрэвапрацоўшчыкаў „По ту сторону щели" у 4-х дзеях, Афінагенава.

Пятніца, 12 ліпеня — „ПУТЬ-ДОРОГА" у 4-х дзеях, 9 эпізодах.

Пачатак а 8 з пал. гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — На прычыне вялікага посьпеху 2-гі тыдзень! „ХВОІ ГАМОНЯЦЬ" выторчасьць Белдзяржкіно. Пачатак сэансу роўна а 8 гадзін. Каса—ад 6 г.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Мастацка-гістарычны фільм Князь Цэран. драма ў 6 ч. Пачатак сэансаў а 9 г. 15 м. Каса—ад 7 гадз. У садзе ад 7 гадз. грае духавы аркестр.

КІНО Інтэрнацыянал — Мастацкі фільм НАПЯРЭДАДНІ драма ў 6 част. Звыш праграмы: Хроніка Белдзяржкіно № 14. Пачатак ад 7 с пал. г. Каса—ад 5 з пал. г.

КІНО Пралетары — Мастацкі фільм ЗА СЬЦЯНОЮ драма ў 7 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка „Совкіно" № 33. Пачатак—а 7 з пал. г. Каса—ад 6 гадз.

КІНО Спартак — Баявік. Баявік. АЛІМ (Крымскі Джыгіт) драма ў 10 частках. Каса адкрыта ад 6 гадз.

СЁНЬНЯ і штодзенна. ДЗЯРЖЦЫРК. Гастролі лепшага мушгравальніка Уладзімера ДУРАВА (маподшага) другі цыкль праграмы Дурава са сваімі зьвярамі. 1-шы раз у БССР Індыйскі мушгравальны СЛОНЬ Макс. 1-шы раз у БССР Расійскі атракцыён сталевыя капітаны Бр. МІРАСЛАЎСКІЯ. 1-шы раз у БССР—адзіная выканальніца пад купалам цырку штэйн-трапэ—ГЕРЦОГ. 1-шы раз 4 ЛЮІДЖЭ-МАРОС 4 турністы і яшчэ рад нумароў.

Па прычыне грандыёзнай праграмы пачатак роўна а 9 гадз. увеч.

VIII сход упаўнаважаных Беларускага Прамысловага Каапэрацыйнага Саюзу Паляўнічых адчыніцца 13 ліпеня а 11 гадзіне раніцы ў памяшканьні Цэнтральнага Дому Селяніна. Пасяджэньне фракцыі КП(б)Б сходу ўпаўнаважаных адбудзецца тамжа, а 10 гадзіне раніцы.

З 12 ліпеня мандаты выдаюцца ў праўленьні, пачынаючы з 9 да 3 з пал. і з 6 да 10 гадзін вечара, а ў дзень адчыненьня сходу—у Доме Селяніна.

Дэлегаты з акруг будуць зьмяшчацца ў гасьцівіцы «Эўропа», квіткі атрымліваюцца разам з мандатамі.

АРГ. КАМІСІЯ.

ЮЖХИМТРЕСТ — ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ — ГЕНЕРАЛЬНЫЙ ПРЕДСТАВИТЕЛЬ ХИМСИНДИКАТ

ПИЛЫ ПОПЕРЕЧНЫЕ от 8-12/4 ТРЕБУЮТСЯ ПРЕДЛОЖЕНИЯ АДРЕСОВАТЬ: Кубокруг, Слав-район, ст. Ивановская, Красный лес.

ЗНОЙДЗЕНЫ абліґацыі пазыкі індустрыялізацыі, на суму 25 руб., сялянскай пазыкі на суму 15 руб. і лётар. білет Асоавіяхіму на 50 кап. Для атрыманьня зьвяруцца у гаспадарчую частку 6 стр. палка.

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакуманту

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

ВЫШАЎ з друку і паступіў у продаж „ЛІПНЁВЫ ГІМН" прысьвечаны вызваленьню Беларусі ад белапалякаў. Словы Ул. Дубоўкі. Музыка Мік.